Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛЮТАГА 2016 г. СУБОТА № 38 (28148) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Робім стаўку на золата

СТАР. 6

Невядомы Мулявін

СТАР. 18

Шукаю хлопца ў інтэрнэце!

СТАР. 20

ЗІМА ЗДАЕ РЫШТУНАК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі сталічнага «Зелянбуда» наводзілі парадак пасля ўчарашняга снегападу, магчыма, апошняга гэтай зімой.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі:

«Міністэрствам энергетыкі Беларусі і Расіі даручана прадставіць прэм'ер-міністрам прапановы па змене формулы цаны на расійскі газ. Ідзе сур'ёзная работа з расійскім бокам па гэтым пытанні. На днях яно абмяркоўвалася ў ходзе сустрэчы прэм'ер-міністраў дзвюх краін. Зараз Беларусь закупляе газ па цане $142,37 за 1 тыс. кубаметраў. Але ёсць істотныя падставы для зніжэння цаны расійскага газу».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.02.2016 г.

Долар ЗША	21482,00	▼
Еўра	23650,00	▼
Рас. руб.	286,05	▲
Укр. грыўня	797,11	▲

ISSN 1990 - 763X

16038

9 771990 763008

■ Сам-насам

Алег РУМО:

«СЭРЦА — ІДЭАЛЬНЫ ОРГАН ДЛЯ ЛЮБОВІ»

Толькі лянівы з маіх калег не рабіў з ім інтэрв'ю. Некалькі гадоў таму Алег РУМО стаў першым у Беларусі хірургам, які перасадзіў чалавеку печань, — і з гэтага часу прэса не пакідала яго без увагі. Сёння ён — кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, які быў створаны дзякуючы яго намаганням, галоўны пазаштатны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук. За гэтымі пасадамі — гады напружанай працы і ахвяраванне вольным часам дзеля галоўнай справы свайго жыцця.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На стале Алега Алегавіча па правы бок — абраз Мікалая Цудатворца, духоўнага заступніка ўсіх лекараў. На паліцы журнальнага століка — томік Новага Запавету. Падчас нашай размовы сам-насам ён адказвае на званкі, паралельна вырашае некалькі пытанняў, але гэта не замінае яму разважаць пра гендарную роўнасць, Беларусь і тое, што «за прыгожыя вочы» нічога ў жыцці не даецца...

СТАР. 10

■ Занятасць

Дзевяць мільёнаў і дом у прыдачу

Вакансіі з жыллём прапануюцца ветурачам, заатэхнікам і інжынерам

На біржы працы ўсё часцей патрабуюцца кваліфікаваныя спецыялісты. А рабочыя прафесіі, доля якіх у агульнай колькасці вакансій летась складала амаль дзве траціны, цяпер займаюць толькі палову рынку. Такую тэндэнцыю адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Якія кадры цяпер карыстаюцца найбольшым попытам, каго могуць забяспечыць жыллём і ці будуць адкрывацца новыя вакансіі?

ПАТРАБУЮЦЦА МЕДЫКІ, ВЫХАВАЛЬНІКІ І ЦЫРУЛЬНІКІ

Сёння ў краіне налічваецца каля 25 тысяч свабодных працоўных месцаў. Найбольш запатрабаваным, як і раней, застаецца медыцынскі персанал. Недахоп адных толькі ўрачоў у краіне — 1,7 тысячы чалавек! Прычым розных профіляў: неабходны педыятры, траўматолагі, эндакрынолагі, хірургі, стаматолагі... Спецыялістаў шукаюць не толькі паліклінікі і бальніцы (там у асноўным прапануюць заробкі ад 3 да 8 мільёнаў рублёў), але і фізкультурна-аздараўленчыя комплексы, санаторыі, дзіцяча-юнацкія школы алімпійскага рэзерву. Свайго медыка хочуць мець і асобныя прадпрыемствы (за што гатовы плаціць 4-6 мільёнаў у месяц). Так, напрыклад, вакансіі ўрачоў адкрыты на Гомельскім хімічным заводзе, ААТ «Нафтан», Аршанскім станкабудаўнічым заводзе.

Установы таксама гатовы прыняць на работу дзве тысячы медыцынскіх сёстраў. Сярэдні заробак, які ўказваюць наймальнікі, — ад 3 да 5 мільёнаў. Высокі попыт застаецца і на фельчараў, фармацэўтаў, правізараў.

СТАР. 4

ДАМАЎЛЯЦЦА ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ

Беларусь не мае закрытых тэм у супрацоўніцтве з Тайландам. Пра гэта заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэм'ер-міністрам — міністрам абароны Тайланда Прабтам Вангсуванам.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, наша краіна гатова дамаўляцца па ўсіх напрамках, па якіх Тайланд хацеў бы супрацоўнічаць. Прэзідэнт адзначыў сур'ёзную настроенасць беларускага боку на павелічэнне тавараабароту і падкрэсліў, што будзе «зроблена ўсё для таго, каб задаволіць запыты Тайланда па любым кірунку». Спектр шырокі: ад навучання кадраў па ваенных і грамадзянскіх спецыяльнасцях да ўзаемных паставак тавараў.

Прэзідэнт Беларусі са шкадаваннем канстатаваў адсутнасць поўнамаштабнай дагаворна-прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва. Кіраўнік дзяржавы выступіў з ініцыятывай стварыць міжурадавую камісію для прапрацоўкі канкрэтных пытанняў узаемадзеяння. Віцэ-прэм'ер-міністр — міністр абароны Тайланда гэтую прапанову падтрымаў. Правіт Вангсуван таксама выказаў салідарнасць з беларускім лідарам наконт павелічэння тавараабароту паміж краінамі і выступіў за тое, каб паскорыць падрыхтоўку пагадненняў у галіне інвестыцый і гандлю.

Высокі госць адзначыў, што Тайланд вельмі цікавіць супрацоўніцтва ў галіне ваенна-прамысловага комплексу, і выказаў пажаданне азнаёміцца з беларускімі абсталяваннем і ваеннай тэхнікай падчас свайго цяперашняга візіту. Віцэ-прэм'ер-міністр — міністр абароны падзякаваў беларускаму боку за цёплы прыём і выказаў надзею на працяг дыялогу і супрацоўніцтва.

Акрамя таго, падчас сустрэчы закраналіся пытанні ўзаемадзеяння ў рэгіянальных інтэграцыйных структурах, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Тайланд зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва з ЕАЭС і запрашае Беларусь, якая надае асаблівую ўвагу рэгіёну Паўднёва-Усходняй Азіі, удзельнічаць у праектах АСЕАН. Бакі абмеркавалі таксама перспектывы ўзаемадзеяння ў сферы турызму і шэраг іншых тэм.

ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ЛЮДЗЕЙ І ПАЛЁТАЎ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 81, рэалізацыя палажэнняў якога будзе садзейнічаць забеспячэнню належнага ўзроўню бяспекі палётаў паветраных суднаў і грамадскай бяспекі.

Указ забяспечвае прававое рэгуляванне выкарыстання сучасных авіямадэляў. Валодаючы небяспечнымі тэхнічнымі характарыстыкамі (вышыня і хуткасць палёту, грузападымальнасць і іншыя), яны сталі шырока даступныя насельніцтву і выкарыстоўваюцца ў спартыўных, забаўляльных мэтах, камерцыйнай і навукова-даследчай дзейнасці.

Нароўні з карысным прымяненнем у розных сферах жыццядзейнасці, авіямадэлі сталі ўяўляць пагрозу карыстальнікам паветранай прасторы Беларусі. Не выключаецца таксама выкарыстанне лятальных апаратаў такога тыпу ў тэрарыстычных, экстрэмісцкіх і іншых злачынных мэтах, у тым ліку ў месцах правядзення масавых мерапрыемстваў. Гэта патрабавала абмежавання выкарыстання авіямадэляў у пэўных выпадках.

Указ № 81 удакладняе паняцце авіямадэляў, устанаўлівае права на іх выкарыстанне ў паветранай прасторы Беларусі без дазволаў органаў Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху. Парадак выкарыстання авіямадэляў вызначыць урад. За парушэнне названага парадку будзе ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасць.

■ На думку парламентарыя

«У саюзе не павінна быць абмежаванняў для яго ўдзельнікаў»

Міхаіл САВАНОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах, член Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі, падзяліўся сваімі думкамі наконт учарашняга пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы.

— Асабліва важна тое, што быў прыняты бюджэт Саюзнай дзяржавы, грошы пойдуць на фінансаванне больш чым 40 сумесных праграм. Вельмі значным пытаннем з'яўляецца ўзгодненае вядзенне знешняй палітыкі — у святле таго, што адбываецца зараз ва Украіне, у Заходняй Еўропе — з яе міграцыйнымі праблемамі. Немалаважную ролю іграюць і пытанні бяспекі, якія таксама разглядаліся на Вышэйшым дзяржаўным савеце.

Было адзначана, што вопыт Саюзнай дзяржавы карысны для будаўніцтва Еўразійскага эканамічнага саюза. Памылак, якія былі ў Саюзнай дзяржавы, мы пастараемся не дапусціць у ЕАЭС.

Сімвалічна, што кіраўнікі краін прыйшлі да высновы: пытанні выключэнняў і абмежаванняў у некаторых дамоўленасцях трэба вырашаць у найбліжэйшы час, а не расцягваць на гады. Саюз значыць саюз, і ніякіх выключэнняў быць не павінна

■

Віктар ГУМІНСКІ:

«ШУКАЦЬ ЛЮБЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ДЫЯЛОГУ»

Нашы парламентарыі прынялі ўдзел у пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ

Дэлегацыю ўзначаліў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар Гумінскі. Падчас пасяджэння Пастаяннага камітэта асамблеі ён выступіў па дакладзе старшыні гэтай арганізацыі Ілкі Канервы — аб сітуацыі ў сферы бяспекі на прасторы АБСЕ і ў сумежных раёнах. Віктар Гумінскі звярнуў асаблівую ўвагу на той факт, што сёння ўдзельнікі пасяджэння нарэшце зразумелі, наколькі крохкі мір і чым гэта пагражае Еўропе.

Наш парламентарый падкрэсліў, што па ўсіх канфліктах амаль прыняты рашэнні і неабходна іх проста выконваць. «Наша арганізацыя павінна ўносіць свой уклад у іх выкананне — каб захаваць мір на гэтай зямлі, — упэўнены Віктар Гумінскі. — Выступаючы ад Беларусі, якая прайшла праз горан войнаў, страціла столькі людзей, з глыбокім пачуццём станоўчых эмоцый кажу, што нарэшце мы пачалі займацца тым, чым павінны: шукаць любыя магчымасці для дыялогу, для канструктыўнага развіцця ўзаемаадносін — каб не дапусціць непапраўнага».

Падчас пасяджэння Пастаяннага камітэта ПА АБСЕ кіраўнік нашай дэлегацыі выступіў таксама і па справаздачы Кента Харстэда, спецыяльнага каардынатара місіі кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЕ на выбарах Прэзідэнта нашай краіны ў мінулым годзе. «Са спадаром Харстэдам мы сустракаліся падчас назірання за выбарамі, адкрыта вялі размову па ўсіх пытаннях, — заўважыў віцэ-спікер ніжняй палаты. — Хачу сказаць, што ўпершыню за апошнія гады быў падрыхтаваны збалансаваны даклад як з боку БДІПЧ, так і Парламенцкай асамблеі АБСЕ».

Віктар Гумінскі звярнуў увагу ўдзельнікаў пасяджэння, што для назіральнікаў на мінулых выбарах у нашай краіне былі створаны ўсе магчымасці для працы. «Я асабіста сустракаўся ў самых розных рэгіёнах з назіральнікамі БДІПЧ, Парламенцкай асамблеі АБСЕ і цікавіўся, ці ёсць нейкія скаргі — і ніхто ні разу мне ніякіх скаргаў не выказаў», — распавёў парламентарый. Па яго словах, даклад падрыхтаваны ў «канструктыўным, узаемапаважлівым, добразычлівым рэчышчы». «Гэта дае глебу для таго, каб мы не проста прыслухаліся, а прынялі рашэнне па выкараненні тых недахопаў — наколькі гэта магчыма — перад будучымі парламенцкімі выбарамі, — заявіў Віктар Гумінскі. — Не ўсё, але многае зрабіць магчыма. Ужо створана міжведамасная працоўная група, якая павінна падрыхтаваць прапановы па паляпшэнні выбарчага заканадаўства нашай краіны. Мы гатовы і надалей да гэтага супрацоўніцтва».

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Блізкая ўлада

ЧАМУ ЛАЗНЯ ПАДАРАЖЭЛА Ў РАЗЫ?

«Ва ўнісон» з патрабаваннем Прэзідэнта разабрацца з правільнасцю налічэнняў платы за «камуналку» прагучалі некаторыя звароты на «прамую лінію» ў Віцебскі аблвыканкам. Людзей выслухаў Аляксандр ПАЗНЯК, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Сярод іншых паскардзіўся жыхар Віцебска. Камунальная арганізацыя выставіла жыльцам рахунак за асвятленне ў пад'ездах — за 6,6 тысячы кілават. Іншая заяўніца незадаволена значным павышэннем платы за абслугоўванне ўваходных дзвярэй з дамафонам. Пенсіянер з Оршы вельмі эмацыянальна абураецца тым, што наведванне лазні падаражэла аж у 2,4 раза.

— Раней плаціў 50 тысяч рублёў. У пятніцу раптам даведаўся, што квіток каштуе 120 тысяч! Зразумела, большасць за такія грошы ў лазню не пайшлі. У суботу «адкруцілі цану назад» — да 80 тысяч рублёў. Але і гэты кошт не рэальны! У мяне пенсія ўсяго 2,5 мільёна. Падлічыце, колькі заплаціць трэба за чатыры наведванні лазні ў месяц? Дзе цяпер мыцца пенсіянерам, якія жывуць у прыватным сектары? — падрабязна распавядаў грамадзянін. І здзіўляўся: чаму недалёка ад Оршы ў лазнях зусім іншыя расцэнкі — і вельмі прывабныя. Трэба цяпер спецыяльна туды ездзіць? Напрыклад, у суседняй Магілёўскай вобласці памыцца можна прыкладна за 20 тысяч. Аляксандр Пазняк даручыў адказным асобам разабрацца ў праблеме. Тым больш што і раней агучваліся аналагічныя пытанні.

Некалькі званкоў паступіла ад жыльцоў дома ў Віцебску. Ён параўнальна нядаўна быў заселены, там больш за 200 кватэр. Навасёлы паскардзіліся, што не ўсе ліфты нармальна працуюць, у пад'ездах дрэннае асвятленне... Асобнае пытанне: чаму ў «выроўках» не ўлічваюцца паказанні індывідуальных лічыльнікаў уліку цяпла?

Аляксандр Пазняк пракаментаваў гэтыя звароты:

— Незадаволеных хвалюе, ці будуць вырашаны камунальныя праблемы, калі. А гэта ўжо недагляд мясцовай улады. Трэба было сабраць людзей, напісаць аб'яву. Маўляў, вырашаюцца пытанні, а калі ёсць праблема, тэлефануйце сюды. Спецыялісты ЖКГ — хто адказвае за працу з жыльцамі — абавязкова павінны былі ўсё растлумачыць. І не было б сённяшніх званкоў.

Усяго за тры гадзіны праблемы агучылі каля 30 чалавек.

— Гэта і ёсць зваротная сувязь з людзьмі. «Прамыя лініі», прыёмы грамадзян дазваляюць кіраўнікам разумець, што ў іх працы павінна быць у прыярытэце. Большая частка званкоў тычылася паслуг ЖКГ. Гэта паказчык таго, што людзей тэма хвалюе. І кіраўнік дзяржавы даў даручэнне вельмі аператыўна вывучыць яе. Добра, што на некаторыя звароты дзяржслужачыя пачынаюць рэагаваць літаральна «з колаў», — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта.

Аляксандр Пазняк асабіста пракантралюе, якім будзе рэагаванне на сігналы, што, на яго погляд, патрабуюць асаблівай увагі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■

■ Падаткі

Зарабіць і не забыцца

Інспекцыя нагадвае, што мінулагодні даход трэба падлічыць і задэкляраваць да першых дзён вясны

У прэс-службе падатковай галіны нагадваюць, што выніковую дэкларацыю ў першую чаргу павінны падаць тыя, хто атрымліваў летась даходы за мяжой і (або) з-за мяжы. У інспекцыю павінны зазірнуць і тыя, хто на працягу каляндарнага года прадаў больш за адзін легкавы аўтамабіль або адзін аўтамабіль, агульная маса якога перавышае 3,5 тоны і (або) колькасць месцаў для сядзення, акрамя сядзення вадзіцеля, перавышае восем.

Дэкларацыю свой даход павінны і тыя, хто прадаў на працягу пяці гадоў больш за адзін жылы дом, адну кватэру, адну дачу, адзін садовы домік, адзін гараж, адно машына-месца ці адзін зямельны ўчастак, калі апошняя нерухомасць належала падаткаплацельшчыкам па праве ўласнасці. Дэкларацыю неабходна і даходы, атрыманыя ў выніку дарэння або ў выглядзе нерухомай маёмасці па дагаворы рэнты бясплатна ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры, які перавышае 43 млн 660 тысяч рублёў у суме ад усіх крыніц на працягу падатковага перыяду. Выключэнне складаюць даходы, атрыманыя ад блізкіх сваякоў, апекуноў і іншых асоб у адносінах блізкага сваяцтва.

У інспекцыях Міністэрства па падатках і зборах па раёнах горада Мінска спецыялісты працуюць па наступным графіку: панядзелак-пятніца з 8:00 да 19:00, а 27 лютага — з 9:00 да 13:00. Жыхары сталіцы больш падрабязную інфармацыю могуць атрымаць па нумары тэлефонна-даведачнай службы падатковых органаў + 375-17-229-79-79.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Раўняцца на лепшых!

Рэкорды зімовай сесіі

У БДУ ўпершыню адкрыта Дошка гонару замежных студэнтаў-выдатнікаў. Яе адкрыццё ініцыявалі ўпраўленне міжнародных сувязяў і Савет зямляцтваў БДУ.

Зараз на ёй размешчаныя фатаграфіі пяці студэнтаў. Трое з іх — з Туркменістана: трэцякурсніца факультэта міжнародных адносін Зейнэп Вякілава, студэнт 3-га курса геаграфічнага факультэта Мердан Чарыеў і чацвёртакурснік эканамічнага факультэта Ікрам Гафураў. Трапілі на Дошку гонару таксама трэцякурсніца Інстытута журналістыкі БДУ, расіянка Ганна Паршына і другакурснік біялагічнага факультэта, беларус Ігар Хасанаў. Хлопец скончыў школу за мяжой і таму паступаў у БДУ па правілах, устаноўленых для замежных студэнтаў. Усе пяцёра маюць бездакорную гісторыю здачы экзаменаў: не менш як 8 балаў — на кожным іспыце.

У прэс-службе БДУ сцвярджаюць, што ва ўніверсітэце ёсць нямала прыкладаў выдатнай вучобы студэнтаў-замежнікаў. А сёлетняя зімовая сесія і ўвогуле парадавала. Так, першакурснік механіка-матэматычнага факультэта Раўшэн Атаеў з Туркменістана здаў сваю першую сесію — усё чатыры экзамены — на 10 балаў кожны! І гэта на факультэце дакладных навук!

Усе студэнты, занесеныя на Дошку гонару, атрымалі скідкі на навучанне. Дарэчы, усяго ў 2015/2016 навучальным годзе скідкі ўстаноўлены сямі замежным студэнтам з Туркменістана, Арменіі і Расіі. Цяпер у БДУ навучаюцца 2 365 студэнтаў-замежнікаў з 50 краін.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Шпацыр па Камароўцы

«УДАРЫМ» ПА АРГАНІЗМЕ ВІТАМІНАМІ!

Надыходзіць каляндарная вясна — самы лепшы перыяд, каб аднавіць вітамінны баланс арганізма пасля зімы. Вядома, найлепшы спосаб — увесці ў рацыён больш садавіны і гародніны. Карэспандэнт «Звязды» накіраваўся на сталічны Камароўскі рынак, дзе хапае як айчыннай, так і прывезенай прадукцыі.

Пачынаем, вядома, з гародніны. Самы запатрабаваны прадукт — беларуская бульба, цана на яе пачынаецца ад 5 тысяч за кіло. Трохі даражэй каштуе морква — ад 7 да 10 тысяч. Ураўвае розніца ў цэнах на памідоры: ад 10 да 15 тысяч за беларускія, 45—55 тысяч за прывезеныя. Рэкардсмен — таматы дробнага гатунку, за іх просяць 60 тысяч. Высокія цэны на гуркі, айчынныя абыдуцца ў 45 тысяч за кілаграм.

Для аматараў страў з капусты раздолле: 8 тысяч за кіло белакачаннай, 25 — за пекінскую, а найдаражэйшая іх каляровая «сястра» — аддаюць за 70 тысяч. Пэўна, на веснавым стале будуць дарэчы і салаты. Самая распаўсюджаная — латук, бюджэтны варыянт у выглядзе гатунку «Рамэн» каштуе 10 тысяч за пучок, ёсць і даражэйшыя, за 15 тысяч. Дадаём да салаты каляровыя перцы — вось і гатовы вітамінны кактэйль. Праўда, бюджэт такая страва абцяжарыць, каштуюць салодкія прыгажуны ад 80 да 100 тысяч за кілаграм. Калі салата без цыбулі для вас непрымальная, можна набыць і яе па 12—15 тысяч за кіло.

Грыбы на рынку прадаюцца ў асноўным сушаныя, нізка баравікоў на вяровачцы абыдзецца ад 100 да 220 тысяч. А вось свежыя шампіньёны каштуюць ад 35 да 45 тысяч.

Пераходзім да садавіны. Просты, але багаты вітамінамі варыянт — яблыкі. Цэны моцна адрозніваюцца ў залежнасці ад гатунку і паходжання, але ў асноўным вагаюцца паміж 20 і 25 тысячамі. Аналагічна каштуюць і грушы. Прыгажуны-бананы абыдуцца ў 20 тысяч за кіло, але можна знайсці іх і па 10 тысяч — з чорнымі плямамі на скурках. Сярэдні кошт апельсінаў — усё тыя ж 25 тысяч, мандарыны абыдуцца трохі даражэй — каля 30.

Шмат на прылаўках вінограду, у асноўным ён каштуе 30—40 тысяч за кіло, але за самыя буйныя і салодкія ягады прыйдзецца выкласці ўжо 55. Спелая хурма таксама добра каціруецца — шмат гатункаў па розным кошце, але ў сярэднім кілаграм ласунку аддаюць за 30 тысяч. Ківі можна ўзяць за 30 тысяч, незвычайны гатунак пад назвай «сунічны» каштуе трохі даражэй — 35. Канцэнтраваны вітамін С у выглядзе лімона аблегчыць кашалёк на 50 тысяч рублёў. І зноў лічба 25 — гэта кошт кілаграма гранатаў.

Попытам карыстаюцца і сухафрукты, іх тут — на любы густ. Фінікі каштуюць 45 тысяч за кіло, курага — ад 80 да 100. Ёсць і гатовыя сумесі з розных сушаных фруктаў і ягад, цэны на іх вагаюцца ад 60 да 150 тысяч. Магчыма, некаму прыйдуцца даспадобы арэхі: 260 тысяч за кіло кеш'ю, 340 — за міндаль.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Лічыльнік «Звязды»

(Сярэдняя цана за кілаграм, калі не пазначана іншае)

Сала дамашняе, салёнае — 100 тыс.
Свіная грудзінка вэнджаная — 95 тыс.
Свіны філей — 160 тыс.
Ялавічына — 120 тыс.
Сальцісон «Хатні» — 95 тыс.
Цялячая грудзінка — 100 тыс.
Ялавічная пячонка — 55 тыс.
Бараніна на рэбрах — 75 тыс.
Паляндвіца — 90 тыс.
Фарш са свініны і ялавічыны — 60 тыс.
Тушка труса — 125 тыс.
Бужаніна — 120 тыс.
Курыная грудка — 40 тыс.
Курыца — 35 тыс.
Скумбрыя вэнджаная — 160 тыс.
Селядзец слабасалёны — 60 тыс.
Яйка курынае (дзясятак) — 17,5 тыс.
Сыр «Галандскі» — 85 тыс.
Алей (бутэлька) — 25 тыс.

АТРЫМАЦЬ ВІЗУ Ў ПОЛЬШЧУ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Ужо 1 сакавіка адкрыюцца новыя візавыя цэнтры. Гэта паспрыяе спрашчэнню працэсу атрымання віз, памяншэнню чэргаў і часу чакання рэгістрацыі візавых анкет.

Адзін з цэнтраў — сталічны — распачне працу па вуліцы Чыгуначнай. Гэта часовы адрас, удакладняе БЕЛТА. Праз дватры тыдні ён пераедзе на пяты паверх ГЗЦ «Galileo» каля чыгуначнага вакзала. У ім будуць працаваць 50 акенцаў для прыёму і выдачы дакументаў. Яшчэ тры цэнтры адкрыюцца ў першы дзень вясны ў абласных гарадах Беларусі: Брэсце (вул. Маскоўская, 208А-1), Гродне (вул. Горкага, 89) і Гомелі (вул. Пушкіна, 2).

Пры падачы дакументаў трэба будзе заплаціць консульскі збор 60 еўра і сервісны за паслугі цэнтра — 15 еўра. Аплачваецца сервісны збор у беларускіх рублях. Браніраваць час падачы дакументаў варта загадзя. Зрабіць гэта можна на сайце візавага цэнтра альбо па тэлефоне кол-цэнтра.

Пры гэтым звяртацца па візу па-ранейшаму можна ў пасольствы ці генеральныя консульствы Польшчы. Пазней візавыя цэнтры з'явяцца і ў Магілёве, Пінску, Баранавічах, Лідзе. «Аб канкрэтных датах будзе паведамлена пазней. Спадзяёмся, што гэта адбудзецца ўжо ў хуткім часе», — адзначыў **Міхал ХАБРАС, часовы павераны ў справах Польшчы ў Беларусі.**

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

БПС-СБЕРБАНК

С 29.02.2016 ОАО «БПС-Сбербанк»:

1. прекращает заключение договоров на Условиях:
- срочного банковского депозита «Сохраняй» от 12.09.2011 № 01-07/310;
- срочного банковского депозита «Пополняй» от 12.09.2011 № 01-07/312;
- срочного банковского депозита «Приумножай» от 03.10.2012 № 01-07/339.

В соответствии с условиями данных депозитов автоматическое переоформление на следующий срок прекращается **с 29.03.2016**.

На невостребованный депозит и причитающиеся по нему проценты после прекращения автоматического переоформления проценты начисляются по ставке текущих счетов физических лиц (0,1% годовых);

2. устанавливает следующий размер процентов по автоматически переоформляемым договорам в иностранной валюте срочных банковских депозитов «Настоящий выбор» от 13.05.2011 № 01-07/153 и «Динамичный» от 18.10.2006 № 01-05/209:

Срочный банковский депозит в ин. валюте «Настоящий выбор»	0,2% (годовых)
Срочный банковский депозит в ин. валюте «Динамичный»	

Установленный размер процентов будет применен **с 29.03.2016**.

Телефон 148
в стационарной и мобильных сетях Velcom, MTC, Life:) 5-148-148
www.bps-sberbank.by

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

■ Разумнікі і разумніцы

ЗА КРОК АД КОСМАСУ

Адразу дзве каманды Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта летам гэтага года запусцяць свае спадарожнікі CanSat. Гэта стала магчымым дзякуючы паспяховай абароне навуковых праектаў спадарожнікаў, створаных ліцэістамі і студэнтамі БДУ, на адборачнай сесіі 5-га інавацыйна-адукацыйнага чэмпіянату «CanSat у Расіі».

У склад студэнцкай зборнай Белдзяржуніверсітэта ўвайшлі першакурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій Іван Саечнікаў, другакурснік гэтага ж факультэта Мікіта Мішчанка і студэнт 2 курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Уладзіслаў Паўловіч. Хлопцы выступалі ў студэнцкай лізе, дзе сталі першымі, набраўшы максімальную колькасць балаў — 98. Летам гэтага года маладым канструктарам неабходна будзе прадставіць спадарожнік вагой да 1 кг, які будзе запушчаны на стратасферным шары на вышыню да 30 км.

Другую каманду Белдзяржуніверсітэта прадстаўлялі ліцэісты Алег Сафонаў, Настасся Патачыц, Мікіта Стрыжак і Антон Інчын. Зборная Ліцэя БДУ распрацавала праект спадарожніка з тэхнічнымі характарыстыкамі, якія забяспечаць яму паспяховыя запуск, вымярэнне, перадачу інфармацыі і прызямленне на парашуце. Усяго ў адборачнай сесіі чэмпіянату «CanSat у Расіі» прынялі ўдзел каля 200 школьнікаў і студэнтаў з Расіі і Беларусі.

Першы конкурс «CanSat» адбыўся ў 1999 годзе ў ЗША. Мэтай чэмпіянату з'яўляецца прыцягненне школьнай і студэнцкай моладзі да касмічных даследаванняў і інфармацыйных тэхналогій.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

З ГАЗАМ ЛЕПШ НЕ «ЖАРТАВАЦЬ»

Спецыялісты газавай сферы па выніках праверак пасля трагедыі ў Барысаве адключылі ажно каля 5 тысяч газавых катлоў і воданагравальнікаў, паведаміў міністр энергетыкі Уладзімір ПАТУПЧЫК.

Паводле слоў міністра, тады былі праверaны ўсе шматпавярховыя дамы, дзе ўстаноўлена газавае абсталяванне. У выніку там было зафіксавана каля 15 тысяч розных парушэнняў, пасля чаго траціна гэтых прыбораў была адключана. «У будучым падобныя праверкі, як і раней, будуць весціся на сістэмнай аснове больш дасканала, што дазволіць вырашаць усе ўзніклыя пытанні», — лічыць Уладзімір Патупчык. Кіраўнік энергетычнай галіны паведаміў, што за апошні час эксперты сістэмы праверылі амаль 125 тысяч адзінак газавага абсталявання па ўсёй краіне.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

АХВЯРЫ ТОНКАГА ЛЁДУ

У Мядзельскім раёне з палонкі даталі мужчыну.

Ранкам жанчына-відавочца патэлефанавала выратавальнікам: на возеры Мястра тоне чалавек. Ад месца здарэння да станцыі АСВОД было каля кіламетра, таму яго спецыялісты разам з работнікамі МНС прыбылі праз некалькі хвілін. Мужчына знаходзіўся на адлегласці 300 метраў ад берага. Пры дапамозе вяроўкі і выратавальнай дошкі пацярпелага даставілі на бераг. Шпіталізацыя мужчыну не спатрэбілася.

А вось у Ляхавіцкім раёне выхад на лёд скончыўся бядой. Каля вёскі Набярэжнай мясцовы жыхар пачаў тануць у Шчары за 20 метраў ад берага. Нягледзячы на тое, што выратавальнікі былі на месцы ўжо праз дзевяць хвілін і даталі пацярпелага з вады, з дапамогай рэанімацыйных мерапрыемстваў вярнуць чалавека да жыцця не атрымалася.

Выратавальнікі нагадваюць, што выхад на тонкі лёд смяротна небяспечны. Пры тэмпературы 0 градусаў і вышэй кожныя тры дні ён патанчаецца на 25 працэнтаў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

КАНТРАБАНДЫСТА ВЫДАЛА... ПАХОДКА

Увагу лідскіх пагранічнікаў у пункце пропуску «Доцішкі» 32-гадовы жыхар Воранаўскага раёна прыцягнуў... сваёй паходкай.

Ён рухаўся быццам робат і, як аказалася пасля праверкі, на тое была даволі важкая прычына. Незвычайная паходка тлумачылася тым, што мужчына хаваў пад адзеннем больш за 130 пачкаў цыгарэт, прымацаваўшы кантрабандны тавар скотчам па ўсім целе. Але «нумар» не прайшоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки, аг. Барсуки и дер. Белая Лужа Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	29 марта 2016 года в 10.00 г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1
3.	**Продавец и его адрес**	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2 **Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1185 га с кадастровым номером 624881701101000411 в агрогородке Барсуки, ул. Полевая **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,0977 га с кадастровым номером 624881701601000121 в деревне Белая Лужа, ул. Лесная **Лот № 4** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная
5.	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6.	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7.	**Начальная цена продажи**	**Лот № 1** – 30 000 000 рублей **Лот № 2** – 100 000 000 рублей **Лот № 3** – 40 000 000 рублей **Лот № 4** – 45 000 000 рублей
8.	**Условия проведения аукциона**	Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников
9.	**Наличие инженерной инфраструктуры**	**Лот № 2 (возможность электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения)**
10.	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641000000263 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»)
11.	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждый понедельник в 15.00
12.	**Окончательный срок приема заявлений**	23 марта 2016 года до 17.00
13.	**Контактные телефоны**	8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

Дзевяць мільёнаў і дом...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Шмат вакансій ёсць для выхавальніка дашкольных установ. Так, сталічныя дзіцячыя садкі маюць патрэбу ў 50 спецыялістах. Дастатковы выбар месцаў для інжынераў — 270 па краіне. Заробак — ад 2,5 мільёна (столькі плацяць, напрыклад, у філіялах агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры) да 9 мільёнаў (прапановы для будучых работнікаў атамнай электрастанцыі ў Астраўцы).

У кадравых агенцтвах адзначаюць, што кампаніі часта шукаюць маркетолагаў. Гэта цалкам лагічна. Выпускаць прадукцыю, не ведаючы, ці будзе яна запатрабавана, прадпрыемству не выгадна. Тым больш цяпер, калі трэба эканоміць кожную капейчыну. Таму спецыялісты, якія могуць прааналізаваць рынкі збыту і падказаць план развіцця вытворчасці, без працы не застануцца.

Што да праграмістаў, то шалёны попыт на іх паслугі чакаецца яшчэ ў найбліжэйшыя 10 гадоў як мінімум. Пакуль беларускія IT-кадры будуць таннейшымі за еўрапейскія, замежныя заказчыкі будуць аддаваць ім перавагу.

Калі казаць пра запатрабаваныя рабочыя прафесіі, то сярод іх — арматуршчык, цясляр-бетоншчык, мантажнік будаўнічых канструкцый. У сельскай гаспадарцы неабходны трактарысты, жывёлаводы, аператары машыннага даення. Для апошніх, напрыклад, прадугледжана каля 300 месцаў. У цане таксама кантралёры-касіры, цырульнікі, кухары. Шмат вакансій прадаўцоў: ад месца за прылаўкам раённага спажыўтаварыства за 3 мільёны ў месяц да працы ў буйных гандлёвых сетках з заробкам у 7 мільёнаў.

— У той жа час па найбольш запатрабаваных у папярэднія гады спецыяльнасцях будаўнічай галіны, а таксама прафесіях кіроўцаў, станочнікаў, слесараў розных профіляў заявак наймальнікаў значна менш, чым беспрацоўных, якія стаяць на ўліку і маюць дадзеныя прафесіі, — паведамляюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

ХОЧАШ ДОМ — ПРАЦУЙ У ВЁСЦЫ

Што да месцаў з прадастаўленнем жылля, то такіх у Агульнарэспубліканскім банку вакансій 2,4 тысячы. У асноўным гэта вакансіі ў сельскай мясцовасці. Больш за ўсё прапаноў у Гродзенскай вобласці — каля 1,4 тысячы. А вось у сталіцы месцаў, дзе наймальнік гатовы забяспечыць жыллём, усяго дзевяць. Кватэр мінскія працадаўцы не абяцаюць — толькі пакой у інтэрнаце або службовае памяшканне.

Шмат вакансій з жыллём для ветэрынарных урачоў. Жылы дом і сем мільёнаў у месяц чакаюць работніка, які паедзе працаваць у аграгарадок Быстрыца Капыльскага раёна. Заробак амаль у дзевяць мільёнаў і дом у прыдачу абяцаюць галоўнаму ветурачу гарадскога пасёлка Бялынічы.

Жыллём могуць забяспечыць і заатэхнікаў. У вёсцы Прудзінкі Верхнядзвінскага раёна спецыяліст гатовы выдзеліць кватэру і плаціць пяць мільёнаў штомесяц. Прыбытак у дзевяць мільёнаў і месца ў інтэрнаце можна атрымаць, калі ўладкавацца ў Пухавіцкім раёне, у філіял малочнага завода.

Шанцы на кватэру ад наймальніка ёсць таксама ў аператараў машыннага даення, інжынераў, прарабаў. Што да аплаты вакансій з жыллём, то большасць наймальнікаў (60 працэнтаў) указваюць заробак да 6 мільёнаў. Доля месцаў з аплатай у 9 мільёнаў і вышэй — 14 працэнтаў.

КАНКУРЭНЦЫЯ ТОЛЬКІ НА КАРЫСЦЬ РЫНКУ

Калі параўноўваць сітуацыю з тым, што было год таму, то попыт на работнікаў, вядома, зменшыўся. Напрыклад, на канец 2014-га ў апрацоўчай прамысловасці была адкрыта 7,1 тысячы вакансій. На канец 2015-га іх налічвалася ўжо 4,3 тысячы. Колькасць месцаў у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы за год знізілася на паўтары тысячы, у гандлі, рамонце аўтамабіляў і бытавых вырабаў — на 600, у транспарце і сувязі — на 300. У такіх умовах канкурэнцыя сярод прэтэндэнтаў на вакансію расце.

Фота БЕЛТА.

У наймальнікаў жа з'яўляецца магчымасць падабраць больш кваліфікаваныя кадры.

— «Перагрэты» рынак у 2012-2013 гадах дазволіў суіскальнікам думаць, што можна прыйсці на працу і нічога не рабіць. І табе калі не тысячу, то пяцьсот долараў абавязкова дадуць, — мяркуе **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай працы і персанале ЗАТ «Атлант» Аляксандр МАШКО**. — Гэта спрацавала супраць наймальнікаў, бо з'явілася катэгорыя, якая бегала з аднаго месца на іншае, не ўяўляючы асаблівай каштоўнасці. А ў кампаніі былі адкрытыя пазіцыі, што пры росце бізнесу недапушчальна. Таму, мне здаецца, сітуацыя цяпер склалася на карысць рынку, але не трэба, каб яна зацягвалася.

Заробкі, якія прапануюцца сённяшнім суіскальнікам, у асноўным невысокія. Чвэрць вакансій маюць аплату ў 3-4 мільёны, яшчэ 22 працэнты — у 4-6 мільёнаў. Доля месцаў з месячным прыбыткам 6-8 мільёнаў — пяць працэнтаў.

Разам з тым на біржы абавязкова будуць з'яўляцца новыя вакансіі, бо скарачэнне штату актуальна не для ўсіх прадпрыемстваў.

— Некаторыя, наадварот, кажуць: выдатна, крызіс. Можна купіць нейкія дзве дадатковыя кампаніі па кошце адной, захапіць долю рынку, якую страцілі канкурэнты, — адзначае **Сяргей ПРЫХОДЗЬКА, дырэктар дэпартамента кіравання персаналам «Альфа-Банка»**. — А гэта ўсё-такі значыць, што будуць новыя працоўныя вакансіі: ад кур'ераў да дыпламаваных спецыялістаў.

■ Рабі дабро

СПОНСАРЫ ЗНОЙДУЦЬ ВАС САМІ

Прыцягнуць грошы ў сацыяльны праект прасцей, чым у бізнес

Як сабраць 50 мільёнаў на распрацоўку адукацыйнай праграмы ці адкрыццё прытулку? Проста: расказаць навакольлю пра сваю ідэю і прапанаваць прафінансаваць. Менавіта так арганізаваны краўдфандынг. І хоць першапачаткова падобныя інтэрнэт-пляцоўкі ствараліся, каб прыцягваць грошы ў камерцыйныя праекты, «сацыялка» ў народных спонсараў знаходзіць не меншы водгук.

КІНАТЭАТР У ПРАВІНЦЫІ І КУРС ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ

Некалькі месяцаў таму ў Мсціславе задумаліся над тым, каб адкрыць свой міні-кінатэатр. Каб моладзі ўвечары было дзе адпачыць. Раней кінатэатр у горадзе быў, але праз аварыйны стан памяшканне даўно не выкарыстоўвалася. **Настаўнік інфарматыкі мясцовай гімназіі Сяргей КАЛЬЦОЎ** прапанаваў абсталяваць для прагляду фільмаў актавую залу навучальнай установы. Закупіць мультымедыйны праектар, вялікі, да 3,5 метра, экран, акустычную сістэму і 3D-акуляры.

— Праз сайт кінатэатра можна будзе выбраць фільм, які спадабаўся, і фарміраваць рэпертуар, — распавядае Сяргей Кальцоў. — А каб павысіць узровень інфармаванасці ў розных галінах навукі і мастацтва, будзем ладзіць тэматычныя прагляды дакументальнага кіно.

На ўсё, па падліках настаўніка, патрэбна было 37,5 мільёна. І суму ўдалося сабраць. Грошы на кіназалу пералічыў 171 спонсар.

Яшчэ адзін праект, які збіраў сродкі з дапамогай краўдфандынгавай платформы, стаў запатрабаваным далёка за межамі аднаго горада. Журналіст Ірына Дзяргач, дырэктар грамадскай арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна Якаўлева і вэб-дызайнер Дзмітрый Валошка вырашылі запусціць адукацыйны курс для педагогаў, псіхолагаў, дэфектолагаў і бацькоў малых з аўтызмам. Гэта 14 анлайн-семінараў на рускай мове, якія будуць у сецівe ў свабодным доступе. Каб арганізаваць такі курс, каманда шукала 27 мільёнаў — на арэнду пляцоўкі для правядзення вэбінараў і аплату замежных экспертаў. Праект «Інклюзія анлайн» падтрымала больш за 130 чалавек: на яго рэалізацыю перавялі 53 мільёны — амаль у два разы больш ад заяўленай сумы!

— Першапачаткова мы нават не разлічвалі на такую раскрутку, — прызнаецца **дырэктар арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА**. — Патрэба ў навучанні беларускіх спецыялістаў і бацькоў асновам аналізу паводзін, сэнсарнай інтэграцыі асаблівых дзетак, напэўна, стала надзвычай актуальнай. Усё гэта веды, а на міжнародным рынку яны каштуюць вельмі дорага.

Курс зацікавіў не толькі беларусаў, але і жыхароў Расіі і Украіны. Таццяна Якаўлева кажа, што даводзіцца пакуль адмаўляць некаторым з тых, хто рэгіструецца для ўдзелу ў семінарах. Па статыстыцы, попыт перавышае прапанову ў 3-4 разы.

СЯРЭДНІ ЧЭК — 400 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

6 з 10 сацыяльных праектаў, што шукаюць сродкі праз краўдфандынг, збіраюць неабходную суму. Такую лічбу прыводзіць платформа «Вулей». Для параўнання: сярэдні ўзровень паспяховасці па інтэрнэт-пляцоўцы — 40 працэнтаў.

Цікава, што і сярэдні чэк, які гатовы выпісаць народныя спонсары на сацыяльны праект, у 1,5 раза вышэйшы, чым па астатніх катэгорыях. Ён складае 300-400 тысяч рублёў. Ёсць, вядома, і больш значныя пералічэнні, на тысячу долараў. Як паказвае практыка, да ідэй, якія фінансуе вялікая колькасць дробных інвестараў, падцягваецца буйны спонсар — бізнес або мецэнат.

Грошы аўтар праекта атрымлівае толькі ў тым выпадку, калі збірае заяўленую суму цалкам. Тэрміны, за якія гэта трэба зрабіць, аўтар вызначае сам. Тое, што пералічылі звыш бюджэту, таксама перадаецца на рэалізацыю ідэі.

— Прынцып «усё або нічога», на мой погляд, з'яўляецца самым сумленным і празрыстым для ўсіх бакоў, — лічыць **дырэктар па развіцці платформы «Вулей» Эдуард БАБАРЫКА**. — Калі аўтар праекта сабраў 25 ці 50 працэнтаў, значыць, ідэя не будзе рэалізавана. Трэба недзе дадаткова шукаць сродкі, якіх не хапае. Гарантаваць, што яны знойдуцца, аўтар праекта не можа, бо калі б былі гарантыі, ён бы першапачаткова заявіў меншую суму.

А калі чалавек збярэ грошы і нічога не зробіць з таго, што абяцаў? Спонсары падтрымліваюць праект на падставе дагавора дарэння. Гэты дакумент не абавязвае аўтара ў выпадку няўдачы вяртаць сродкі. Але ёсць сацыяльная адказнасць, якой, прыцягнуўшы сотню інвестараў, не ўдасца пазбегнуць.

СПОНСАРА ТРЭБА ЗАЧАПІЦЬ ГІСТОРЫЯЙ

Сярод праектаў, якія засталіся без фінансавай падтрымкі, — прытулак для жанчын з дзецьмі ў Бабруйску, серыя адукацыйных брашур аб эпілепсіі, маладзёжны фестываль, дзе можна было б пазнаёміцца з адукацыйнымі праграмамі і стажыроўкамі. Не знайшло водгук, бо не патрэбна?

— Я гаварыў бы не пра ідэю (бо пасыл у сацыяльных праектаў падобны), а пра падыход. На першы план для краўдфандынгу выступаюць эмоцыі і гісторыя, якая расказваецца ініцыятыўнай групай. Важна, як выкладаецца праблематыка, як апісваецца рашэнне, ці натхняе яно людзей на тое, каб далучыцца да праекта. Ці дастаткова высілкаў прыкладае аўтар, каб пра праект даведалася як мага больш людзей. Варта мець дэталёва прапрацаваны маркетынгавы план, — каментуе Эдуард Бабарыка.

Для кожнага спонсара прадугледжаны падарунак. У выпадку з кінатэатрам у Мсціславе, тым, хто перавёў на рахунак 30 тысяч, абяцалі па тры квіткі на любыя сеансы ў гэтай кіназале, людзям, якія не пашкадавалі 500 тысяч, — магчымасць бясплатна прыходзіць на паказы ўвесь год. На думку Эдуарда Бабарыкі, матэрыяльная падзяка, безумоўна, уплывае на рашэнне дапамагчы праекту, але ідэя і гісторыя для спонсара важнейшыя:

— Бонусы толькі дапамагаюць сарыентавацца ў парадку коштаў, рэгулююць значнасць учынку. Іх мэта — узмацніць эмоцыю.

Пакуль праекты, якія збіраюць грошы на беларускай краўдфандынгавай пляцоўцы, маюць бюджэт да 5 тысяч долараў. Але, мяркуюць на «Вуллі», сума ўжо зараз можа быць у 10 разоў вышэйшай.

— Краўдфандынг упершыню прадаставіў простаму чалавеку магчымасць уплываць на будучыню. Права выбіраць, — лічыць дырэктар па развіцці пляцоўкі. — Гэта практычна перадзамова. Калі чалавек проста дасылае грошы на дабрачынны рахунак, ён не заўсёды адчувае датычнасць да працэсу. У сітуацыі з праектамі вынікі больш наглядныя, ёсць цесная эмацыянальная сувязь. Задаволенасць ад такога тыпу фінансавання нашмат вышэйшая ■

Матэрыялы паласы падрыхтавала Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Уважаемые акционеры ОАО «Белбакалея»!

30 марта 2016 года
СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Белбакалея»,

по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал

Повестка дня собрания:

1. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе за 2015 год.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год и об основных направлениях развития Общества на 2016 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2015 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2016 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений и дополнений в условия крупной сделки (взаимосвязанных сделок) с ЗАО «Альфа-Банк».
10. О передаче полномочий на решение наблюдательного совета ОАО «Белбакалея».
11. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и утверждение его в новой редакции.

С материалами, подготовленными по вопросам повестки дня собрания, можно ознакомится по адресу: **г. Минск, ул. Промышленная, 15, комната № 7 с 9.00 до 17.00** (понедельник–пятница) с 10 по 29 марта 2016 года, 30 марта 2016 года – по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию **на 1 марта 2016 года.**

Регистрация участников собрания **30 марта 2016 года с 9.00 до 13.45** по месту проведения собрания. Начало работы собрания – **30 марта 2016 года в 14.00.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»

УНП 100025653

■ Расклад на заўтра

ПА АКІЯНЕ ВЕДАЎ З ПАДРУЧНІКАМ-НАВІГАТАРАМ,

або Як вучыць сучаснае пакаленне школьнікаў?

Ці можна стварыць падручнік, які задаволіць усіх: і вучняў, і бацькоў, і педагогаў? Ёсць меркаванне, што падручнік — бяздушная кніга, а «жывую душу» ў яго можа ўдыхнуць толькі настаўнік. Гэта інструмент, і для таго, каб ён добра загучаў, патрэбны таленавіты выканаўца. Ці гучала б так чароўна скрыпка Страдывары без рук і душы Паганіні?

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Новае ці праверанае?

Сёння да нацыянальнага падручніка прыкаваная ўвага з боку ўсяго грамадства. Уручаючы дыпломы дактароў навук і атэстаты прафесараў навуковым і навукова-педагагічным работнікам, Прэзідэнт краіны зноў узняў тэму падручнікаў, адзначыўшы, што «ў нас нямала вучэбнай літаратуры, якая не адпавядае сучасным патрабаванням як па форме, так і па змесце».

Сучасныя школьныя падручнікі грашаць перагружанасцю тэкставым вучэбным матэрыялам, складанасцю выкладання, недастатковай колькасцю ілюстрацый, дыяграм, схем і табліц, невялікай колькасцю заданняў праблемнага характару, звязаных з рэальным жыццём. Ёсць прэтэнзіі і да дызайну большасці падручнікаў, у тым ліку шрыфтавага афармлення...

Апошнім часам усё часцей гучаць заклікі вярнуцца да праверaных часам савецкіх падручнікаў.

— Гэта немагчыма па многіх прычынах, — лічыць **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі (НІА), кандыдат філалагічных навук Сяргей ВАЖНІК.** — Па-першае, істотна змяніўся змест многіх вучэбных прадметаў, не стаіць на месцы навука. Па-другое, змяніліся самі дзеці, склад іх розуму: яны інакш успрымаюць свет, не хочуць чытаць доўгія тэксты... Да таго ж з'явіліся сучасныя сродкі навучання. Аднак з савецкіх падручнікаў мы павінны ўзяць ўсё самае лепшае: прастату і яснасць выкладання, даступнасць матэрыялаў для разумення, каб новы падручнік не нагадваў навуковы трактат.

Да таго ж, нават у савецкія часы дасканалым лічыўся падручнік, які перавыдаваўся не менш як 10 разоў. З кожным чарговым перавыданнем падручнікі ўдасканальваліся і шліфаваліся. А беларускі падручнік — зусім малады.

Не атрымліваць веды, а здабываць!

Да 2020 года ў краіне плануецца падрыхтаваць і выдаць 299 найменняў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку 185 новых выданняў.

— Вясной мінулага года было прынятае рашэнне аб пераходзе на адносную завершанасць базавай адукацыі і профільнае навучанне на старшай ступені школы, — уводзіць у курс справы Сяргей Важнік. — Вучань, які заканчвае базавую школу, павінен ведаць увесь асноўны змест прадмета, чаго не назіралася, напрыклад, у курсе гісторыі, які заканчваўся ў 9-м класе падзеямі 1917 года. Натуральна, што новыя падручнікі павінны распрацоўвацца ў строгай адпаведнасці з новымі вучэбнымі праграмамі. Пры гэтым аўтар павінен бачыць не толькі праграму канкрэтнага класа, а ўсю лінейку, бо патрабуецца разуменне таго, што і як вывучалася раней і якая перспектыва вывучэння зместу канкрэтнага прадмета.

Да жніўня мінулага года ў Нацыянальным інстытуце адукацыі былі распрацаваныя новыя тыпавыя вучэбныя планы для першага, пятага і дзясятага класаў, вучэбныя праграмы для гэтых класаў, электронныя матэрыялы для размяшчэння іх на нацыянальным адукацыйным партале і г. д. А цягам верасня — снежня была распрацавана ўся лінейка праграм для першых — адзінаццатых класаў... **Змяненні закранулі 233 праграмы, у якіх быў зменшаны аб'ём тэарэтычнага матэрыялу, выключана складаная тэрміналогія, вучэбны матэрыял быў адаптаваны пад узрост навучэнцаў.**

Праграмы пераглядаліся таксама з пазіцый іх пераемнасці і міжпрадметных сувязяў. Праграмы па фізіцы і хіміі цяпер добра карэлююць з праграмай па матэматыцы і надвароt.

— Паслядоўнае абнаўленне зместу праграм было прадыктаванае і новымі мэтамі: нашы вучні павінны не проста атрымліваць гатовыя веды, а вучыцца самастойна іх здабываць, каб прымяняць затым на практыцы, — падкрэслівае Сяргей Важнік. — Падручнік новага пакалення павінен быць асобасна і практыка-арыентаваным, утрымліваць творчыя заданні для самастойнай працы і матэрыялы для самакантролю, якія дазволяць замацаваць пройдзены матэрыял, засвоіць паняцці і тэорыю і прымяняць іх у вырашэнні канкрэтных жыццёвых сітуацый. Тая ж матэматыка павінна быць прывязана да жыцця...

Аўтары — у вострым дэфіцыце

З 1 верасня Нацыянальны інстытут адукацыі арганізаваў і правёў тры этапы конкурсу па стварэнні новых вучэбных дапаможнікаў па 20 прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Цяпер праходзіць ужо чацвёрты этап па 18 прадметах. У конкурсе прымаюць удзел вядомыя аўтарскія калектывы, вучоныя, настаўнікі-практыкі і метадысты.

— Але пры правядзенні конкурсу мы сутыкнуліся з адсутнасцю канкурэнцыі паміж аўтарскімі калектывамі, — канстатуе Сяргей Важнік. — Калі ў першым этапе конкурсу па кожным прадмеце ўдзельнічалі ад трох да сямі аўтарскіх калектываў, то на трэцім этапе па пятнаццаці прадметах — толькі па адным калектыве. Так, з'явіліся і новыя імёны аўтараў, але ў большасці выпадкаў у конкурсе ўдзельнічаюць толькі калектывы, якія стваралі цяперашнія падручнікі. Ёсць праблема і з кваліфікацыяй аўтараў. Прызнаныя, на жаль, старэюць, а новым не заўсёды хапае патрэбнага досведу. Каб наладзіць сістэмную працу з патэнцыяльнымі аўтарамі падручнікаў, мы прапануем арганізаваць пры інстытуце пастаянна дзеючы семінар, на якім бы абмяркоўваліся праблемы стварэння падручнікаў новага пакалення.

«Пакажы мне, і я запомню»

Летась у Нацыянальным інстытуце адукацыі ўпершыню была распрацавана і зацверджана Канцэпцыя базавага падручніка. Мяркуецца, што ён будзе ўключаць мінімальна неабходны аб'ём тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, а да яго будуць прыкладацца электронныя дадаткі, якія пашыраць і дапоўняць асноўную інфармацыю: у іх змесціцца дадатковы ілюстрацыйны, даведачны і кантрольна-ацэначны матэрыял.

Яшчэ адна інавацыя НІА — падручнік-навігатар для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У найбольш агульным сэнсе змест электроннага падручніка-навігатара ўяўляе сабой сінтэз розных відаў тэксту: вербальных, графічных, аўдыя і візуальных (анімацыі і відэа). Яны складаюць мультымедыйны кантэнт падручніка-навігатара. Кітайская мудрасць сцвярджае: «Скажы мне, і я забуду. Пакажы мне, і я запомню. Дай зрабіць мне самому, і я навучуся!» Гэту магчымасць дзейнічаць самастойна і прадастаўляе падручнік-навігатар, які фактычна стварае новае навучальнае асяроддзе.

У адрозненне ад паліграфічнага выдання, **падручніку-навігатару ўласцівыя такія функцыі як інтэрактыўнасць, разнастайнасць кантрольна-вымяральных матэрыялаў, у тым ліку з аўтаматычнай праверкай, наяўнасць зваротнай сувязі (рэакцыя з боку электроннага падручніка на дзеянні навучэнца ў выглядзе каментарыя, дапамогі ці падказкі), магчымасць выбудоўвання індывідуальнай адукацыйнай траекторыі.** Падручнік выконвае функцыю навігацыі па ўсіх кампанентах вучэбна-метадычнага комплексу. Гіпертэкставая арганізацыя матэрыялу дазваляе хутка перайсці да неабходнага раздзела параграфа, слоўніка або тэкставых заданняў. А пры неабходнасці можна выйсці па спасылцы на рэсурс аддаленага доступу, напрыклад, на сайт або партал, дзе размешчаны іншыя кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу (хрэстаматыі, даведнікі, іншы дадатковы матэрыял). У ідэале падручнік-навігатар павінен быць такім, каб яго можна было выкарыстоўваць на розных тыпах электронных прылад — ад інтэрактыўнай дошкі да планшэта і смартфона.

Ужо створаны макетны ўзор такога падручніка па арганічнай хіміі для 10 класа. Педагогі з Ліцэя БДУ спецыяльна для новага падручніка запісвалі міні-фільмы з дэманстрацыяй хімічных вопытаў. Цяпер ён праходзіць доследную апрабацыю ў ліцэі. Распрацаваны рэкамендацыі па стварэнні такіх падручнікаў і па іншых вучэбных прадметах.

Карыкатура як спосаб вывучэння гісторыі

А якіх прынцыпаў прытрымліваюцца стваральнікі падручнікаў у іншых краінах? У фінскіх падручніках, напрыклад, большасць старонак прамаркіраваныя. Гэта дапамагае вучням арыентавацца ў відах работ (заданнях): зялёны колер — новая тэма, жоўты — заданні для самастойнай работы, сіні — для адпрацоўкі навыкаў, чырвоны — хатнія заданні. У рамках адной тэмы аўтары стараюцца прытрымліваць пэўнай логікі падачы матэрыялу: на развароце старонак падручніка злева прыводзяцца прыклады, а справа даюцца тэставыя задачы. У выніку вучань ужо з пачатковай школы засвойвае сістэму знакаў. Таму яму прасцей прыстасавацца да сучаснага інфармацыйнага грамадства, лёгка арыентуючыся ў імклівых інфармацыйных патоках.

У апошнія дзесяцігоддзі ў замежных падручніках назіраліся змяненні ў суадносінах тэксту і выяўленчага матэрыялу. Перш за ўсё адбылося павелічэнне плошчы, якая адводзіцца для ілюстрацый. Яны не толькі дапаўняюць тэкст падручніка, але і дапамагаюць раскрываць яго змест. У падручніках некаторых краін — такіх, напрыклад, як ЗША, Ірландыя, Швейцарыя — значнае месца сярод ілюстрацыйнага матэрыялу займаюць лаканічныя картасхемы.

Характэрнай асаблівасцю сучасных еўрапейскіх падручнікаў па гісторыі з'яўляецца прысутнасць у іх значнай колькасці карыкатур. Як правіла, аўтары выкарыстоўваюць карыкатуры ў матэрыялах, прысвечаных падзеям XX стагоддзя. Лічыцца, што ствараючы ў вучняў яркі вобраз падзеі або з'явы, карыкатуры могуць паспрыяць больш трываламу замацаванню ў памяці гістарычных фактаў і іх ацэнак.

Новы трэнд — нестандартныя біяграфіі, якія аўтары падручнікаў адбіраюць, каб паказваць чалавечае жыццё на фоне эпохі як вынік свядомага выбару свайго лёсу. Так, у адным з англійскіх падручнікаў главу аб падрыхтоўцы да Другой сусветнай вайны завяршае біяграфія Чэмберлена. У ёй зроблена спроба растлумачыць, якія менавіта рысы характару і погляды прывялі англійскага прэм'ера ў Мюнхен, і чаму ён дапусціў там фатальную памылку. **Падобны падыход да адбору біяграфій дазваляе пазбегнуць спрошчанасці ў асвятленні гістарычных працэсаў.**

У Францыі, Іспаніі і Партугаліі гісторыя з геаграфіяй аб'ядноны ў адной школьнай дысцыпліне. Лічыцца, што, калі гістарычны тэкст перамяжоўваецца з геаграфічным матэрыялам, гэта спрыяе больш эфектыўнаму выкладанню гісторыі. А геаграфічныя карты і схемы дапамагаюць школьнікам арыентавацца ў прасторы, дзе адбываліся тыя ці іншыя гістарычныя падзеі

■ Цяпло Зямлі

ГЕАТЭРМАЛЬНАЯ ЭНЕРГІЯ — АЛЬТЭРНАТЫВА НАФЦЕ І ГАЗУ

Завяршыліся работы па стварэнні геатэрмічнага атласа Беларусі, які характарызуе параметры цеплавога поля зямных нетраў краіны.

У склад атласа ўвайшло каля 50 геатэрмічных карт. Гаворка ідзе пра цеплавы стан зямных нетраў, пра тую частку цяпла, якую можна было б здабываць і выкарыстоўваць для практычных мэтаў. Яго можна выкарыстоўваць, найперш, для ацяплення будынкаў і збудаванняў у зімовы час і іх кандыцыянiравання летам у прамысловым і аграрным сектарах эканомікі. У адрозненне ад відаў паліва, якое спальваецца і прыводзіць да забруджвання атмасферы парніковым вуглякіслым газам, падземнае цяпло — экалагічна чыстая і аднаўляльная крыніца энергіі.

Разлікі паказваюць, што цяпло, назапашанае ў верхніх 3 км зямной кары кантынентаў, эквівалентнае энергіі, якую чалавецтва спажывае на працягу прыблізна 100 000 гадоў пры сучасным узроўні яе выкарыстання. У еўрапейскіх краінах, дзе цэны на нафту і газ значна вышэйшыя, чым у нашай краіне, цяпло, якое здабываюць з зямных нетраў, з поспехам выкарыстоўваецца ў народнай гаспадарцы і прамысловасці. Напрыклад, сёння каля 320 тысяч дзеючых геатэрмальных установак паспяхова функцыянуюць у Швецыі. А ў суседняй Польшчы іх колькасць ацэньваецца ў 11 тысяч.

У нашай краіне перадумовай для геатэрмічнага вывучэння зямных нетраў з'явілася наяўнасць анамалій павышаных тэмператур і шчыльнасці цеплавога патоку ў межах асноўных блокаў зямной кары. Сістэматычнае вывучэнне геатэрмічнага поля вядзецца ў Беларусі з 70-х гадоў XX стагоддзя.

У выніку праведзеных даследаванняў былі выяўлены кантрасныя палі размеркавання тэмпературы і шчыльнасці цеплавога патоку ў платформенным чахле рэгіёну. Цяпер у Беларусі дзейнічаюць каля 150 геатэрмальных установак з сумарнай цеплавой магутнасцю парадку 7 МВт. Найбольш буйная з іх (у 1 МВт) пабудавана на цяплічным камбінаце «Бярэсце», размешчаным на ўсходняй ускраіне Брэста.

— У бліжэйшыя гады патрабуецца будаўніцтва двух-трох пілотных геатэрмальных станцый і ўстановак у паўночнай зоне Прыпяцкага рэгіёну — найбольш прагрэтым блоку зямной кары — для адпрацоўкі як тэхналагічных схем, так і для ўдакладнення тэхніка-эканамічных паказчыкаў эксплуатацыі гарачых тэрмамінеральных вадкасцяў і расолаў, — кажа **прафесар геафака Белдзяржуніверсітэта Уладзімір ЗУЙ**.

Па сутнасці, геатэрмальныя рэсурсы — гэта тая энергія, якую можна эканамічна рэнтабельна здабываць у найбліжэйшай будучыні

■ Іх выбар

НАВУКА БЫЦЬ ЛІДАРАМ!

Школа актыву «Студэнцкі лідар — жыццё на віду!» адкрылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Гэта новы адукацыйны праект, скіраваны на развіццё лідарскіх якасцяў у моладзі. Вучэбная праграма разлічана на тры месяцы і ўключае лекцыі, майстар-класы і трэнінгі. Студэнцкіх лідараў навучаць камандаўтварэнню, распрацоўцы праектаў, арганізацыі мерапрыемстваў. Акрамя таго, яны асвояць тэорыю і практычныя заняткі па мастацтве пераканання, аратарскім майстэрстве, канфлікталогіі, мастацтве кіравання і прыняцця рашэнняў. Будучыя лідары навучацца адстойваць свой пункт гледжання, ісці на кампраміс, адчуваць аўдыторыю, эфектыўна ўзаемадзейнічаць для дасягнення жаданага выніку.

У якасці спікераў будуць выступаць супрацоўнікі БДУ, а таксама псіхолагі-практыкі, кіраўнікі вядомых інфармацыйных і маркетынгавых агенцтваў

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

РОБІМ СТАЎКУ НА ЗОЛАТА?

Цяпер жыхары і нашай краіны могуць набываць каштоўныя паперы міжнародных біржавых фондаў (ETF), якія ўкладаюць фінансы ў каштоўныя металы

Першым сярод айчынных фінінстытутаў гэтую магчымасць фізасобам адкрыў Альфа-банк. Эксперты адзначаюць, што сёння кліентам прапануюць новы механізм укладання зберажэнняў, дзе пры ўдалым прагнозе па золаце можна атрымаць прыбытак, які ў некалькі разоў перавышае даходнасць па валютных дэпазітах.

ЗНАЧНАЯ КАПІТАЛІЗАЦЫЯ

Новы для Беларусі інструмент дазваляе зарабіць на золаце, але пры гэтым дадаткова не траціцца на захоўванні фізічных зліткаў. Беларусам прапануецца некалькі залатых фондаў ETF (Exchange Traded Funds). Сярод іх — SPDR Gold Trust (GLD), IAU і SGOL. Капіталізацыя толькі GLD складае каля 60 млрд долараў, што параўнальна з ВУП невялікай краіны. Многія інвестфонды ўкладаюць толькі ў золата, але ёсць і тыя, хто купляе таксама і серабро.

ЗАРАБЛЯЦЬ НА ТЭНДЭНЦЫЯХ І З МІНІМАЛЬНЫМ СПРЭДАМ

Велічыня даходнасці інвестыцый у «залатыя» паперы, наўпрост прывязана да кошту золата. Прыбытак можна атрымліваць у двайным або трайным памеры — такі даход, напрыклад, атрымалі летась кліенты высокадаходных фондаў DGP і UGL. Пры гэтым розніца паміж цаной пакупкі і продажу акцый ETF складзе ўсяго 0,5%, што на парадак ніжэй, чым пры рэалізацыі залатых зліткаў.

Новы механізм выгадна адрозніваецца ад звыклай для беларусаў формы «залатых» інвестыцый — куплі мерных зліткаў. Справа ў тым, што для іх захоўвання трэба арандаваць дэпазітарную ячэйку. Акрамя таго, пры жаданні перавесці золата ў гатоўку беларускія банкі выкупяць яго назад па кошце, які будзе на 18-35% ніжэйшым за дзеючую цану (велічыня спрэда залежыць ад банка і масы злітка). Банк таксама папросіць паказаць дакументы, атрыманыя пры куплі зліткаў.

ДАХОДНАСЦЬ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СТРАТЭГІІ І СМЕЛАСЦІ

Укласці грошы ў залатыя фонды можна толькі праз давернае кіраванне банка. Пры працы «па загадзе» мадэль інвестыцый вызначае кліент, а вось пры поўным даверным кіраванні спецыяліст камерцыйнага банка накіроўвае частку сродкаў і ў іншыя фінансавыя інструменты. У апошнім выпадку адбываецца дыверсіфікацыя рызыкі. Розніца ў гэтых падыходах істотная.

Пры самастойнай стратэгіі ўладальнік сродкаў атрымлівае шанц атрымаць большы прыбытак і пры гэтым амаль не дзяліцца даходам з банкам. Пры поўным даверным кіраванні спецыяліст банка ўжо зацікаўлены ў правільным укладанні сродкаў кліентаў, бо частка прыбытку ад здзелкі пакідаецца банку. Усё гэта так, але трэба дакладна ведаць, што банк ад вас грошы за атрыманыя паслугі возьме ў любым выпадку, нават тады, калі ад вагання курсаў на золата кліент прыбытку ўвогуле не атрымае.

НА ДОЎГАТЭРМІНОВУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ Ў... «ЦІХУЮ ГАВАНЬ»

Новы інструмент арыентаваны на беларусаў, якія вераць у золата, але да гэтага пазбягалі ім займацца, бо баяліся другасных выдаткаў. Цяпер жа, каб зарабляць на высакародным метале, не трэба набываць мерных зліткаў, плаціць за арэнду ячэек і губляць грошы на высокім спрэдзе. «Акрамя таго, можна лёгка «выйсці з золата», калі раптам складзецца неспрыяльная кан'юнктура», — упэўнены эксперты гэтага перспектыўнага напрамку.

Розніца паміж цаной пакупкі і продажу акцый ETF складзе ўсяго 0,5%, што на парадак ніжэй, чым пры рэалізацыі залатых зліткаў.

Многія фінансавыя структуры прадракаюць пэўны поспех такім новым механізмам, асабліва ў сувязі са зніжэннем працэнтных ставак па дэпазітах. Дастатковая колькасць людзей з грашыма пачала сёння больш актыўна шукаць цікавыя спосабы па сапраўдным захаванні сваіх зберажэнняў, а золата заўсёды паказвала добрую дынаміку ў неспакойныя часы, лічылася ўкладаннем на доўгатэрміновую перспектыву і было гарантыяй захавання інвестыцый. Нездарма ўсе дзяржавы ствараюць уласныя залатыя запасы — напрыклад, у Беларусі ён перавышае 38 тон і пастаянна павялічваецца.

Сітуацыя на гэтым рынку сёння сапраўды спрыяльная. Цяпер золата даражэе пасля невялікага зніжэння каціровак у канцы мінулага года. Сусветныя аналітыкі называюць гэта новым вітком росту. Пакуль цэны на нафту захоўваюць няпэўнасць, а фондавыя біржы развіваюцца без асаблівых поспехаў, інвестары разглядаюць золата як «ціхую гавань».

У ЗЛІТКАХ ЯНО ЗНАЧНА ДАРАЖЭЙШАЕ

Самы дарагі кошт аднаго грама золата з сертыфікатам якасці ад Нацбанка прыпадае на мерны злітак гэтага металу менавіта вагой 1 грам.

Нацыянальны банк краіны прадасць гэты злітак юрыдычным і фізічным асобам (за выключэннем банкаў) за 1 мільён 82 тысячы 200 рублёў. А вось калі ўладальнік гэтага злітка вырашыць яго прадаць назад Нацбанку, то пры наяўнасці сертыфіката якасці, атрымае толькі 844 тысячы 100 рублёў.

Залаты злітак ад Нацбанка вагой 5 г будзе каштаваць новаму ўладальніку 4 млн 848 тысяч 300 рублёў. Назад гэта золата з дакументамі возьмуць за 4 млн 177 тысяч 300 рублёў. Злітак у 10 г каштуе сёння для насельніцтва 9 млн 436 тысяч 800 рублёў (8 млн 376 тысяч 200 рублёў). Ажно 116 млн 55 тысяч 100 рублёў (83 млн 762 тысячы 300 рублёў) каштуе цяпер мерны злітак золата вагой 100 г. Самы вялікі злітак мернага золата вагой 1 кілаграм наш банк прадасць любой асобе ажно за 1 млрд 90 млн 186 тысяч 600 рублёў (837 млн 579 тысяч 500 рублёў).

Нацыянальны банк прапануе сёння спажыўцам і мерныя зліткі з серабра. Кавалак у 10 г гэтага металу прададуць кліенту за 324 тысячы 700 рублёў. А вось назад купяць яго, пры наяўнасці сертыфіката якасці, толькі за 108,2 тысячы рублёў. Заўважу, што менавіта па сярэбраных зліткаў існуе самая вялікая дэльта паміж коштам куплі і продажу. Так, 100-грамовы мерны злітак з серабра Нацбанк прадасць фізічнай асобе за 2 млн 121 тысячу 100 рублёў, а назад прыме толькі за 541 тысячу 100 рублёў. Самы сур'ёзны злітак з серабра (1 кілаграм) каштуе тут 25 млн 150 тысяч 300 рублёў (вернуць — 10 млн 692 тысячы 100 рублёў).

Самы вялікі злітак мернага золата вагой 1 кілаграм наш банк прадасць любой асобе ажно за 1 млрд 90 млн 186 тысяч 600 рублёў.

Самы маленькі мерны злітак з плаціны вагой 1 грам каштуе ў нашым банку 1 млн 103 тысячы 800 рублёў. Спрэд у каціроўках па гэтым метале таксама ўражвае, бо банк купіць гэты злітак назад толькі за 649 тысяч 300 рублёў. Максімальна вялікі злітак плаціны з сертыфікатам ад Нацбанка важыць 500 грам і каштуе 557 млн 830 тысяч 800 рублёў (332 млн 538 тысяч 900 рублёў). Нагадаю, што каціроўкі па зліткаў каштоўных металаў карэктуюцца нашым фінансавым рэгулятарам у адпаведнасці з сусветнымі тэндэнцыямі і іншымі фактарамі ў валютным сектары. Прыведзеныя вышэй лічбы выстаўлены Нацбанкам на дату дзеяння цэн з 23 лютага 2016 года.

■ Сталіца

КВАТЭРЫ ЗДАЮЦЬ АМАЛЬ 60 ТЫСЯЧ МІНЧАН

А падатковыя стаўкі на даходы ад арэнды для іх плануюць павялічыць на 15%

Пра гэта паведаміў намеснік начальніка аддзела падаткаабкладання фізічных асоб інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску Дзмітрый Плеўскі.

У прыватнасці ён адзначыў, што на гэты конт цяпер рыхтуецца адпаведнае рашэнне Мінгарсавета. Удакладню, што гаворка ідзе аб павелічэнні ставак падатку ў фіксаваных сумах на даходы ад здачы кватэры ў доўгатэрміновую арэнду.

А пакуль уласнікі некалькіх кватэр плацяць штомесяц за кожны пакой свайго даходнага жылля ад 140 тысяч да 240 тысяч рублёў у адпаведнасці з эканоміка-планіровачнай зонай прапіскі сваёй нерухомасці. А яшчэ ў падатковай адзначылі, што ў апошні час колькасць зарэгістраваных кватэраздатчыкаў у сталіцы павялічваецца. Па стане на 1 студзеня 2016 года на ўліку ў інспекцыях Мінска ў якасці кватэраздатчыкаў было зафіксавана 59,5 тысячы такіх уласнікаў. Год таму падобных плацельшчыкаў было амаль на 7 тысяч чалавек менш. Спецыялісты падлічылі, што летась ад гэтай дзейнасці ў бюджэт сталіцы паступіла 103,5 млрд рублёў.

Акрамя таго, у мэрыі плануюць, што ўжо гэтай вясной будуць павялічаны падатковыя стаўкі і для тых, хто здае сваё жыллё на суткі. Па гэтай катэгорыі дзейнасці ўласнік жылля павінен спачатку зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і аплачваць ужо адзіны падатак. Для кватэр, дзе пакояў не больш за два, стаўка складае 900 тысяч рублёў, а для больш прасторных кватэр падатак складае 1,8 млн рублёў у месяц.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Уважаемые акционеры ОАО «Ресторан «Беларус»! УНП 100055804

29.03.2016 года

СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Ресторан «Беларус»,

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15А.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 и основных направлениях развития Общества на 2016.
2. О работе Наблюдательного совета в 2015.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества и работе ревизионной комиссии в 2015.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2015.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2015. О выплате дивидендов за 2015.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2016 и в I квартале 2017 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об увеличении уставного фонда путем увеличения номинальной стоимости акции за счет чистой прибыли.
10. Об утверждение новой редакции Устава общества.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг – акций ОАО «Ресторан «Беларус» для составления списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, – **14.03.2016.**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15А, с 14.03 **по 28.03.2016** (время работы с 9.00 до 17.00) **либо 29.03.2016** по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – **29.03.2016 в 15.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного **на 14.03.2016.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Булат Иван Викторович ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОДАЖЕ АКЦИЙ ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования»
в количестве 663 простых акций (8,6160% Уставного фонда) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день оплаты.
По вопросу приобретения обращаться по адресу: г. Солигорск, а/я 16, м.т. +37529-2502759.

ОАО «Минскгрузавтотранс»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 29 марта 2016 г. ОЧЕРЕДНОГО (ГОДОВОГО) ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Повестка дня:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2015 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2015 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2016 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии, избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. О перечислении части прибыли в инвестиционный фонд Министерства транспорта и коммуникаций Республики Беларусь.
8. Об утверждении Устава ОАО «Минскгрузавтотранс» в новой редакции.

Собрание состоится по адресу:
г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2 (2 этаж, к. 11).
Начало собрания в 14.00.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни (понедельник–пятница) начиная **с 17 по 28 марта 2016 года с 08.30 до 13.30**, в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться **с 13.00 до 13.45** в день и по месту проведения собрания – по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров и доверенности.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию **на 4 марта 2016 года.**

Справки по тел. (8-017) 2229824.

УНП 100028545 ***Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».***

ОТЧЕТ
Местного благотворительного культурно-исторического фонда памяти Первой мировой войны «Кроки» за 2015 год

Учредители — 3 человека.
1. Стоимость имущества фонда:
Учредительский взнос — 5760000 рублей.
Спонсорская помощь — 92650000 рублей.
Поступления от проведенных мероприятий — 3400000 рублей.
Проценты банка — 304288 рублей.
Итого: 102114288 рублей.
Общая сумма расходов, понесенных фондом, согласно уставу, на общественно-полезные цели, — 10949990 рублей
По состоянию на 20.02.2016 года
Остаток на счету — 3400000 рублей.
Долгосрочные активы — 116590360 рублей.
Краткосрочные активы — 5140860 рублей.
Итого: 125131220 рублей.

Предпринимательская деятельность не осуществлялась, хозяйственные общества не создавались.

Директор фонда Пресняков А.А.
20.02.2016 г.
УНП 691150277

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛБУД»

Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество «Белбуд»,

расположенное по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ.

Собрание состоится **31.03.2016 в 15.00** по адресу: **220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, конференц-зал.**
Регистрация участников производится по месту проведения собрания – **31.03.2016 с 14.30 до 14.50** на основании списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 году и основных направлениях развития Общества на 2016 год.
2. Утверждение заключений аудиторской и ревизорской проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках Общества за 2015 год.
4. Утверждение распределения чистой прибыли за 2015 год и направления ее использования в 2016 году.
5. Определение рекомендуемого размера вознаграждения и компенсаций расходов членам Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
6. Избрание членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации необходимо иметь при себе паспорт, представителю акционера – доверенность и паспорт.
Лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться с документами, подготовленными к собранию, с 20.03.2016 (понедельник–четверг – с 8.30 до 17.00, пятница – с 8.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.20) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 (в приемной генерального директора), а в день проведения Собрания – по месту его проведения.
Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 28.03.2016.
Телефон для справок – 8017 237 29 54.
УНП 100794022

ОТЧЕТ УНП 790386638
Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение – Агро» об использовании своего имущества за 2015 год

Количество учредителей Местного фонда развития сельских территорий «Возрождение – Агро» – 10 человек, из них 10 – физические лица.
Информация о стоимости имущества местного фонда развития сельских территорий «Возрождение – Агро» (далее – Фонд):
- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 3 500 000 белорусских рублей;
- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с Уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 81 273 800 белорусских рублей и 143 852,33 евро;
- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством – 13 092 849 белорусских рублей.
Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 1 204 942 493 белорусских рублей.
Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

ВЯСНА Ў ГУМАВЫХ БОТАХ

...Ведаеце, як і дзе я некалі пазнаёміўся са сваімі сябрамі дзяцінства? Год дакладна ўжо не прыгадаю, але пара была веснавая. Праўда, толькі па календары, бо калісьці большая частка сакавіка па сутнасці заставалася яшчэ зімой. Хіба толькі напрыканцы месяца ў паветры пачынаў адчувацца подых сапраўднай вясны, ды і тое ўдзень, бо ўначы працягвала падмарожваць. Дык вось, менавіта ў гэты час мне ў рукі нейкім чынам патрапіў таўшчэзны кавалак сасновай кары. І ўзнікла ідэя зрабіць не проста караблік, а катар. Што і было зроблена рукамі бацькі пад маім чулым «кіраўніцтвам».

Ледзь дачакаўшыся заканчэння спуску судна «са стапеляў», я пабег праводзіць яго выпрабаванні. Для гэтага далёка хадзіць не трэба было, дастаткова толькі адчыніць весніч кі. Па схіле нашага завулка якраз міма іх бег, набіраў сілу ручаёк. Вада ў ім была празрыстая, сам ён — зусім невялікі. З-за гэтага мой катар увесь час разварочвала, ён чапляўся за берагі. Галоўным было выхапіць судна з ручайка да таго моманту, пакуль той не ўліваўся ў бурную цёмную плынь на скрыжаванні, інакш з катарам можна было развітацца назаўсёды: вада залівала ўсю вуліцу, прыхапіўшы і частку агародаў абапал, і кацілася ўжо з адчувальным шумам і з бурунамі, несучыся да не такой далёкай Волмы. І вось менавіта ў наш ціхі завулак з тымі ж мэтамі — папускаць караблікі — завітаў напачатку Андрэй, потым Колька і Віталік. З гэтага ручайка і пачалося наша сяброўства.

Вядома, усім гэтым штогадовым веснавым падзеям з паводкай гэтак жа рэгулярна папярэднічалі снежныя зімы. Я не памятаю ў дзяцінстве — да 1986 года — каб хоць бы якая з іх была без снегавога покрыва. Так, часам яно было большым, часам меншым, але без снегу ўвогуле не абыходзілася. Самыя яскравыя ўспаміны зімовага часу тычацца выхадной нядзелі. У школу не трэба, прачынаешся з добрым настроем. У доме светла і ўтульна ад бялюткага снегу за вокнамі і яркага сонейка і блакітнага неба. Прычым зараз чамусьці ёсць уражанне, што такое надвор'е было заўсёды, прынамсі, пахмурнае не прыгадваецца. Перад тым, як паліць у печах, абавязкова адчынялі форткі і свежае марознае паветра пачынала прыемна казытаць нос. Потым насілі дровы, ваду з калодзежа, бацькі завіхаліся, гатуючы бліны з мачанкай... Маці абавязкова або рабіла хатняе печыва, або смажыла вялікую патэльню сланечнікавых семак. Вулічнае паветра, цяпло ад печак, смачны водар ежы, пах гарачага алею змешваліся... Сваю нотку дадавала друкарская фарба ад унесеных у дом газет, якія толькі што апусціла ў скрыню паштальёнка, бразнуўшы — пакінуўшы сігнал накрыўкай, і пад чыімі нагамі пакрысе сціхаў у іншым канцы завулка хруст снегу. Іх я чуў, бо адразу ж бег да паштовай скрыні, нават не зашпіліўшы паліто... Мабыць, гэта і ёсць — пахі і гукі дзяцінства?.. Раз-пораз за месяц бацька выносіў з хаты дываны, раскладаў на свежым белым покрыве, і мы з братам дапамагалі іх выбіваць. А потым, нацярушыўшы зверху снегу, змяталі яго венікамі.

А яшчэ мы, дурні, спрабавалі на іх катацца, балазе, усё абышлося. Неяк паспрабаваў стаць на крыгу, што прыбілася да берага. Добра, што зрабіў толькі крок, бо адразу ж праваліўся па калена.

Ад працы на марозным паветры станавілася горача, асабліва галаве пад шапкай з труса. Мы перавозілі дух, слухаючы мелодыю капяжу з даху. Кожны раз здзіўляла, як так адбываецца, што па празрыстых ледзяшах, якія ззяюць-пераліваюцца ў сонечных прамянях, вада бяжыць нават у мароз. Хоць і ведалі: гэта магчыма з-за ўхілу даху. Як толькі дзень пераходзіў за другую палову, мелодыя пакрысе суцішвалася. Затое шчабятанне шматлікіх птушак працягвалася да вечару. Шумныя вераб'і і сініцы, крыклівыя сарокі і галкі, пунсовыя шарыкі-снегіры, часам дзятлы і нават крыжадзюбы... Трэба было абавязкова падсыпаць ім семак у кармушку, а насупраць акна павесіць на нітачцы на галінку кавалачак сала, каб потым назіраць імклівыя налёты-наскокі на яго чорна-жоўтых вяртлявых сініц. Не тое што снегіры і крыжадзюбы, а нават сініцы потым фактычна зніклі з поля зроку і толькі адносна нядаўна пачаў заўважаць шматлікіх вядомых з дзяцінства птушак не толькі ў вёсцы, але нават у горадзе.

Калі прыгадваюць «Хаўер» ці «Даніэлу», я ўсміхаюся. Пад першы цыклон патрапіў, вяртаючыся з працы. Ведаеце, зноў жа — як у дзяцінства перанёсся! Завея! «Хаўер» за каўнер! Не тое каб тады нас так вось закідвала снегам, але яго хапала, і мы былі да яго звыклыя. Зрэшты магу прыгадаць адну зіму, калі пасля моцнага снегападу вузкую, але даволі «глыбокую» вулку на шляху да дома стрыечнага брата закідала так, што над белым покрывам тырчалі толькі невялікія вярхушкі штыкецін агароджы. Адчуванне было, што ты ідзеш па самім плоце, на ўзроўні дахаў дамоў непадалёку. Гэта я ўсё расказваю да таго, каб было зразумелым, якія некалі былі вёсны.

Снег сыходзіў калі месяц, калі паўтара. Калі працэс зацягваўся, шчыра кажучы, гэта надакучвала. Бо на гэты час нашым асноўным абуткам станавіліся гумавыя боты. Калі напачатку першую ваду яшчэ можна было абысці па мешаніне, якая распаўзалася пад нагамі, уздоўж плота, трымаючыся за дошкі, ці скарыстацца іншым шляхам, дык неўзабаве яна была паўсюдна, і мы хадзілі ў гэтых ботах нават у школу, нацягнуўшы на шарсцяныя шкарпэткі. Паток талай вады і яго хуткасць па-

Раней зімы былі марознымі і снежнымі...

...таму і паводкі былі паўнаводнымі.

крысе павялічваліся. Яна ішла адным і тым жа шляхам, таму на прылеглых да яго агародах, на вуліцах заўсёды загадзя былі пракапаныя канавы, якія рэгулярна чысцілі. Але неўзабаве «вялікая вада» залівала і першыя, і другія. У нейкі момант мужчыны з навакольных дамоў мусілі ладзіць імправізаваную кладку: перакідваць цераз паток дошкі. Добра, калі яны былі шырокімі і трывалымі. А тое, здаралася, што ідзеш па хісткай пераправе, ад тваіх крокаў дошкі акунаюцца ў ваду, і баішся, каб не паслізнуцца і не ўпасці. Дарэчы, цяпер ад тых канаў практычна няма напамін у — так даўно не здараліся вялікія паводкі. Не Палессе, канешне, але ўсё ж... Моц патоку прабівала ў спрасаваным на скрыжаванні снезе і лёдзе сапраўднае рэчышча, даючы магчымасць ацаніць таўшчыню слою — сантыметраў 20-30. Счарнелы ад зямлі лёд у цяні мог ляжаць і да сярэдзіны красавіка. І калі вада прыносіла дарослым адны непрыемнасці — заносіла смеццем агароды, змывала ўрадлівы слой глебы, залівала калодзежы — дык што для нас было цікавым у гэты час года?

Вядома ж, хадзіць на раку! Назіраць, як пакрысе ўзрываўся лёд, вада выходзіла з берагоў. На адным з участкаў былі два пагоркі побач, калі ўзровень падымаўся, яны нагадвалі гарбы вярблюда ці спіну лох-нескай пачвары. Да іх можна было прайсці па мелкаводдзі, і тады ты адчуваў сябе ледзьве не палескім рабінзонам! А каб прайсці, трэба было мець не проста боты, а сапраўдныя рыбацкія, у якіх падымаліся халявы. І такія ў мяне былі! Як зараз памятаю, купілі іх па маёй вялікай просьбе ў сталічнай краме «Паляванне і рыбалоўства». Нічога, што на памер больш, мяне гэта ніколькі не засмучала. І вось у нейкі дзень ужо можна было ўбачыць, як велізарныя крыгі нясуцца па цёмнай вадзе да моста, б'юцца ад яго палі і, разламаўшыся, працягваюць свой шлях уніз па цячэнні... А яшчэ мы, дурні, спрабавалі на іх катацца, балазе, усё абышлося. Неяк паспрабаваў стаць на крыгу, што прыбілася да берага. Добра, што зрабіў толькі крок, бо адразу ж праваліўся па калена.

На адным з участкаў былі два пагоркі побач, калі ўзровень падымаўся, яны нагадвалі гарбы вярблюда ці спіну лох-нескай пачвары. Да іх можна было прайсці па мелкаводдзі, і тады ты адчуваў сябе ледзьве не палескім рабінзонам!

Яшчэ адна любімая веснавая справа — рыбалка. Калі вада ўваходзіла ў берагі і яны пераставалі быць топкімі, мы даставалі свае вуды і зноў абувалі гумавыя боты. Дзякуючы колішнім разлівам і рыба магла нармальна аднерасціцца, і яе, адпаведна, было больш. Прыгадваю, як старэйшыя лавілі шчупака на жыўца спінінгам прама з моста. І вылоўлівалі ж, выклікаючы ў нас, малечы, непамерную зайздрасць! Цяпер у межах пасёлка наўрад ці можна разлічваць на добры ўлоў, трэба ехаць у іншае месца. Праўда, раней мы і драбязе былі рады. Аднойчы я так «насёрбаў» цэлае вядзерца верхаводак. Але глядзеў больш не на ўласны паплавок, а на мужчыну-рыбака непадалёк. Што была мая дзіцячая вуда супраць яго? Пра глыбіню ракі сведчыла тоня на яго снасці — каля трох метраў. Ён закідваў яе на сярэдзіну Волмы адмысловым спосабам, а потым выцягваў велізарных яршоў. Яны сваёй вагой і супраціўленнем згіналі канец вуды дугой, а затым цяжка выляталі з вады, растапырыўшы ў паветры спінны плаўнік і жабры, бліснуўшы жаўтаватым пузам... Далібог, гэта быў першы і апошні раз, калі я бачыў у сваім жыцці такіх вялікіх яршоў!.. Адзін год, калі вада спала, усё дно невялікага азярца побач з рэчышчам ракі, якое ўжо было адрэзаным ад яго, засцілалі загінулыя ўюны...

Апотым у нейкі момант у прыродзе нешта зламалася. Пачаліся не тое, што вёсны без вады, але і зімы без снегу, што для нас па першым часе было вельмі дзіўным. Калі працягнуць пра тую ж рыбалку, раскажу адзін выпадак, дакладней, адзін грашок. Прайшло шмат часу, цяпер можна. Неяк старэйшыя стрыечныя браты вырашылі крыху пабраканьернічаць: прайсціся па рацэ ноччу з сеткай. Узялі і нас, маладзейшых. Не столькі ў дапамогу, колькі для кампаніі. Частка з яе перайшла раку ўброд, балазе ўзровень быў невялікі. Ішоў халодны нудотны дождж, ногі ў тых самых гумавых ботах раз'язджаліся ў гразі... Мы фактычна нічога не злавілі, толькі ад душы нацягаліся з ракі ілу і таплякоў. Ведаеце, калі ўсё адбывалася? Год зноў жа дакладна не памятаю, гэта быў пачатак 1990-х, а вось дату чамусьці запомніў — 19 студзеня. Вось вам і зіма...

Раней у цёплым адзенні працягвалі хадзіць амаль да канца сакавіка. А потым гадоў на пяць-шэсць запар патрэба ў зімовых паліто і куртках, шапках з футра, не кажучы ўжо пра валёнкі, якія былі звыклымі для нашага дзяцінства, фактычна адпала цягам ледзьве не ўсяго каляндарнага перыяду, які нават і зімой называць не выпадала. Тады зноў жа часам выручалі гумовікі... Пасля такога перарыву першыя сапраўдныя маразы здарыліся недзе бліжэй да сярэдзіны 1990-х. Не такім ужо частым, як хацелася, нагадваннем яны вяртаюцца да нас і цяпер — раз-пораз. Мне іх не хапае. Не паспяваю іх прачуваць, як усё, скончылі ся... Таму хацелася б скончыць анекдотам. «Я не расіст, але зіма павінна быць белай». А вясна — паўнаводнай...

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by
Фота аўтара.

Чым не «палескія рабінзоны»?

Отчет Местного фонда
«Центр поддержки сельского развития и предпринимательства Столинского района» об использовании своего имущества за 2015 год.

Количество учредителей Фонда – 18, в том числе 15 физических лиц.
Стоимость имущества Фонда, в том числе:
- переданного учредителями фонда – 4 100 000 рублей,
- поступления от проводимых в соответствии с Уставом Фонда мероприятий 2 766 123 268 рублей,
- доходы от предпринимательской деятельности 14 324 047 рублей,
- иные поступления, не запрещенные законодательством, 419 861 596 рублей.

Сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его Уставе, составила 1 988 667 510 рублей.

Фонд является учредителем унитарного предприятия «Сельская Столинщина», зарегистрированного в Едином государственном регистре за №291046099 26 сентября 2011 года.

Фонд не является участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

УНП 290460165

Наблюдательный совет

ОАО «Белхозторг»

ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА.

Собрание состоится 30 марта 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова. 34, к. 401 (4-й этаж)

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2015 году и основных направлениях развития ОАО «Белхозторг» на 2016 год.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белхозторг» за 2015 год.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2015 год.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2015 год.
5. Установление размера дивидендов за 2015 год.
6. Определение срока выплаты дивидендов за 2015 год.
7. Установление периодичности и порядка выплаты дивидендов в 2016 году.
8. Утверждение направлений использования чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2016 год.
9. О работе наблюдательного совета в 2015 году.
10. Избрание нового состава наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
11. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
12. О добровольном выходе из состава участников Ассоциации организаций оптовой торговли.

С информацией, подлежащей рассмотрению на годовом общем собрании акционеров, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Платонова, 34, 4-й этаж.**

Регистрация участников собрания состоится **30 марта 2016 года с 11.00 до 11.55** по месту проведения собрания. Дата составления списка акционеров **14 марта 2016 года.**

Для регистрации при себе иметь:
- акционеру Общества – документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера Общества – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет ОАО «Белхозторг»

УНП 100230626

■ Простая мова

САМЫ ДАРАГІ ПАДАРУНАК

Не жаночая гэта справа — маўчаць. Таму зноў — што бачу, што чую...
Вечар, значыць, аўтобус, вольнае месца — і якраз жа пад лямпачкай, але пачытаць не лёс: дзве бабулі насупраць, а шуму — як ад пяці. Пагаварылі пра новыя цэны на ваду, тут жа «пераскочылі» на расаду, перамылі костачкі нейкай модніцы (у той паліто на гузіках не толькі спераду, але і ззаду)... Здаецца, сціхлі? Не:
— Паглядзі, які кавалер, — паказвае адна кабета другой (і — адпаведна — іншым).
— Ага, — адгукаецца сяброўка, — п'янаваты, старавaты, але з кветкамі. Відаць, да жанчыны едзе.
— З чырвонымі гваздзікамі?
— А можа, яна камуністка?
...Можа. Чаму ж не?

НЕ ПА КАТУ САЛА

Прыяцель збірае грошы — не на нешта, а на нешта. У сэнсе — не на мэблю, кватэру ці новы тэлевізар, а на тое, каб мець — кроны, маркі, грыўні, злотыя, царскія рублі, савецкія капейкі, долары, еўра... Каб час ад часу перабіраць іх, каб цешыцца.

Надоечы расказаў, як яму пашчасціла — манету знайшоў. Галоўнае — пад нагамі, на асфальце ляжала... Падняў, праз гразь убачыў, што яна ні на што не падобная, што вось гэтакай і ў руках не трымаў...

Схаваў у кішэнь. Хуткім крокам пашыбаваў дадому.

Па дарозе ўяўляў яшчэ, як зараз (ісці ж зусім недалёка) адчысціць яе і будзе любавацца, вывучаць...

Адзінае — у твар яму біў вецер, вымушаў час ад часу даставаць з кішэні насоўку, каб выцерці вочы, нос...

Карацей, уваліўшыся ў хату, ён убачыў, што той рэдкай манеты ўжо няма, як карова языком злізала!

«Ну добра, — потым казаў, — няхай нашы, беларускія грошы ў кішэнях цяпер не трымаюцца... А то ж і чужыя — як прыйшлі, так і пайшлі!..»

Крыўдна!

НА ПАМЯЦЬ

...Дзед Ягор будаваўся з розумам: дом свой ставіў на ўскрайку горада, на беразе ракі. Сад пасадзіў адразу ж, рад маладзенькіх ліп...

Пад імі выраслі і замуж павыходзілі ягоныя дочкі, падгадаваліся трохі ўнукі, а вось далей ужо не пашчасціла. Горад разбудаваўся і, відаць жа, немалыя грошы знайшоў, каб раку ў парадак прывесці, каб «ачысціць» набярэжную ад прыватных дамоў.

Дзеду за яго сялібу дзве двухпакаёўкі далі: адну старэйшай дачцэ з мужам і дзіцем, другую малодшай — з дзіцем і ім, тым самым дзедам (бо жонка яго да таго часу памерла)... Грошай яшчэ трохі сплацілі — за пабудовы і сад.

Такія былі законы, такія парадкі — тады. Цяпер жа...

Тая ўскраіна даўно не ўскраіна, а сам горад — прэстыжны раён. Зямля ў ім каштуе шалёных грошай. Участкі тым не менш прадаюцца... І нават купляюцца! Дзед за свой мог бы выручыць з паўмільёна долараў! Аднак...

Яго самога ўжо няма.

Няма і таго ўчастка. Толькі ліпы стаяць, як свечкі...

І тыя не ўсе.

АПОШНЯЯ ВОЛЯ

На могілках, ну вядома ж, спачатку да сваіх, а ўжо потым да іншых. Тым больш што побач — новая «стрэшка» з яркіх вянкоў. Цікава ж, над кім злажылі?

Прозвішча, на жаль, не відаць (патанула ў кветках), але... чуваць.

— Гэта Дзянісіху пахавалі, — тлумачыць нейкая незнаёмка. — Непадалёк тут жыла, з дачкой, з Маняй. Яна і сабе, бач, пры мамцы месца пакінула... А вось муж яе — не. У вёсцы баялі, ён дзяцей папрасіў, каб яго асобна дзе пахавалі. Сказаў, што жонка з цешчай яму на гэтым свеце пячонкі выелі — не хоча, каб яшчэ і на тым.

Апошняя воля.

У СТРАХУ ВОЧЫ ПА ЯБЛЫКУ

Некалі зіма на тое і зіма, каб снег, каб мароз ды мяцеліца...

Цяпер з іх трэба праблему зрабіць, назваць, напрыклад, нейкім жаночым імем і на ўсе мабільнікі просьбу «скінуць»: маўляў, калі ласка, расчысціце снег каля вашай машыны.

Дванаццацігадовы Міхась гэту эсэмэску таксама атрымаў. Спытаў: «Няўжо нехта думае, што ў мяне машына ёсць?».

...Мяркуючы па іх колькасці ў сталічных дварах, — ёсць.

Можа, і не адна.

ШТО АДДАЎ — ТВАЁ!

Жальбіны — сяброўкі не стала: ужо год жывём без яе і... з ёю, бо, здаецца, дня не было, каб хоць раз не згадалі! Ды і як жа інакш, калі на кухні — яе гадзіннік (некалі даўно падарыла — з пажаданнем не заўважаць...), яе імбрычак, лыжачка, ручнічок (што аддаў — тваё... Геніяльная фаза!), яе крыжык, абразок, ваза для кветак...

А галоўнае — кнігі.

У яе — пісьменніцы Лідзіі Арабей — апроч безлічы іншага, ёсць вельмі простае апавяданне, называецца яно — «Другі». Змест, коратка: хлопец жыў у заводскім інтэрнаце, хораша іграў на гітары, быў душою кампаніі, ад якой, нават ажаніўшыся, адарвацца не мог. Ды і не давалі... Таму ён часцяком сыходзіў — бавіў час не з сям'ёй. Жонцы гэта, вядома ж, не падабалася, яна падала на развод. Думала, муж спалохаецца, пашкадуе сына і тут жа пераменіцца. А калі і не, то такой бяды — знойдзецца ж нейкі іншы!

Яна не памылілася: знайшоўся і сапраўды (аж праз восем гадоў... А хацелася ж раней...) — старэйшы за яе, разведзены, нябедны. Але зусім чужы — што яшчэ палова бяды. А цэлая — у тым, што ён, мякка кажучы, не любіць яе сына. І жанчына, не маючы магчымасці за яго заступіцца, увачавідкі бачыць, што не трэба было спяшацца з разводам, што сябры з таго заводскага інтэрната раней ці пазней пажаніліся б і раз'ехаліся, што першы муж пасталеў бы і, напэўна ж, «асеў» бы дома, што сын тады гадаваўся б з любімым бацькам, а яна не жыла б абы з кім...

Памылковая, відаць, выснова, але... чамусьці здаецца, што, калі б жанчыны, якія збіраюцца скасоўваць шлюб, прачыталі гэтае апавяданне, разводаў было б менеў.

...Пісьменнікі паміраюць. Творы іх, думкі, учынкі, дзякаваць Богу, застаюцца. І вучаць жыць — тых, хто чытае.

ВЫБАР

Ён кахаў яе...

Яна яго — як здавалася — таксама...

І, хутчэй за ўсё, яны пажаніліся б, калі б...

Хлопец пайшоў у войска. Дзяўчына — як часам здараецца — яго не прыждала: выйшла замуж за іншага, нарадзіла дзяцей...

Але варта было аўдавець — праз дзесяцігоддзі (!) — як той даўні кавалер зноў «з'явіўся на гарызонце». І на гэты раз ужо не адступіў: развёўся з жонкай (бо ўсё роўна, казалі, там жыцця не было), пераехаў з горада ў вёску і на тое ж падбіў яе. Зажылі. Разам...

Цуд, якім дагледжаным стаў іх дом! Які сад і горад, які парадак на падворку! Якая лазенька паўстала каля хаты, якая ўтульная альтанка! Колькі дрэўцаў з'явілася і прыгожых кустоў... Ён пасадзіў (зрабіў, прыдумаў, давёў да ладу) — для каханай жанчыны і новай сям'і, для сваіх сяброў і сусядзяў, для ўсіх вяскоўцаў...

А мог бы (не хочацца думаць) — нічога не мяняць, жыць, як жыў: сабачыцца з жонкай, сядзець у гарадской кватэры ці на лавачцы ля пад'езда, глядзець па тэлевізары, як жыве нехта.

Ён выбраў іншае — жыць самому.

ІНТРЫГА

Прыяцелька доўга шукала, але ўсё ж знайшла новую працу. Добрую ці дрэнную — у першы месяц нічога не казала. Ды і які сэнс быў распытваць? Трэба ж чалавеку прыгледзецца, трэба разабрацца.

Часу на гэта многа не пайшло — да першай зарплаты. Жанчына атрымала яе, не паверыўшы, двойчы пералічыла. І сказала потым, што работа, вядома ж, нялёгкая, начальнік — прыдуркаваты, сядзець там трэба ад званка да званка, калі нават працы няма, але ж (даслоўна) «за такія грошы я згодная... Нават у турме».

Суму, шкада, не агучыла.

А цікава ж!

Ці ў кожнага яна свая?

ПРАВІЛА ЖЫЦЦЯ

Грошы на новую кватэру гэта сям'я збірала доўга. І не сабрала б, відаць, ды пашчасціла выгадна прадаць старую: з'явілася якая-ніякая капейка — на дыхтоўную сантэхніку і абліцоўку, на прыгожыя шпалеры, на паркетную дошку.

Купляць яе гаспадар паехаў з майстрам, з паркетчыкам. Як аказалася, цікавы чалавек — філосаф па адукацыі. Ды і па жыцці... Ва ўсякім разе паглядзеў ён на тую «дошку», на цану яе і, пачухаўшы патыліцу, выдаў:

— Грошы, вядома ж, вашы, і як іх траціць, вам вырашаць... Але я б не пераплачваў. Па мне — лепш звычайны паркет.

Прадаваўся ён побач, на тым жа рынку. Разам прыцаніліся, падлічылі кошт — матэрыялу, работ. Атрымалася, што і сапраўды можна сэканоміць...

І — як потым высветлілася — не толькі на паркетнай дошцы, бо з крылатым «я б не пераплачваў» гэтая сямейка — каторы ўжо год — купляе прадукты, адзенне, абутак, ездзіць у адпачынак... Як знайшлі яго — правіла жыцця.

Якім па сённяшнім часе грэх не падзяліцца.

ЗА ШТО?

Горад. Праспект. Скрыжаванне. Дзве абвесткі на слупе: адна прапануе працу, другая — грошы. Відавочна — у доўг, пад высокі працэнт...

Што цяпер, абмеркаваць не паспяваем: нейкая маладзіца пытаецца, як ёй дабрацца да крамы «Прырода», і, пачуўшы адказ, не ведае, як аддзячыць! Прынамсі, прыклаўшы руку да сэрца, яна разоў колькі прамаўляе сваё: «Дзякуй!.. Найшчырэйшы вам дзякуй!»

...Як быццам мы прапанавалі ёй добрую працу. Ці грошы.

САМЫ ДАРАГІ ПАДАРУНАК

«Я хацеў бы спаткацца з вамі на вуліцы ў ціхую сінюю ноч...»

Гэта — Багдановіч. Некаму...

Волечцы яе Максім спатканне прызначыў на плошчы, непадалёк ад працы, у шэсць гадзін вечара.

Як дачакацца іх, дзеўка не ведала: двое сутак то ў адной, то ў другой сукенцы круцілася перад люстэркам.

І напярэдадні не магла ад яго адысціся: усё папраўляла прычоску, падмалёўвала вочкі і, вядома ж, пазірала — то на гадзіннік, то за акно.

Там, дзякаваць Богу, сапраўды пачынала цямнець, але... ад хмар, з якіх а шостай вечара на зямлю абрынуўся дождж — сцяною.

Праз яе — халодную, густую — дзяўчына глядзела туды, дзе блізкая плошча, і не ведала, што ж ёй рабіць? Не пайсці ці спазніцца на гэта спатканне — крый Бог, бо хлопец, здаецца, каханы. Але і прыбегчы да яго такой вось мокрай курыцай (як на ліха, парасона няма!) — тым больш!

«Усё, гэта канец...» — думала яна стоячы на ганку.

Міма яе з плошчы «плылі» машыны.

І раптам адна (Воля хоць-нехаць бачыла) стала прытарможваць, «адрывацца» ад іншых, ціснуцца на... тратуар — у цэнтры Мінска! А потым і наогул — падруліла пад самы ганак і стала.

З яе, на хаду раскрываючы парасон, выскачыў кіроўца...

У постаці як быццам нешта знаёмае? Максім?!

Так, гэта ён!.. Перад ёю (сэрца з грудзей!) адчыняе дзверцу.

У сухой новенькай сукенцы, у светлых замшавых туфліках, з прыгожай прычоскай і макіяжам, на вачах ва ўсіх Вольга садзіцца ў машыну...

Яны едуць.

...За дваццаць гадоў сумеснага жыцця ў іх сямейцы здаралася ўсё: хапала і будняў, і святаў — з рознымі падарункамі.

Але такога вось болей не было. Гэты, здаецца, самы лепшы.

Валянціна ДОЎНАР.

ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 30 марта 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.	Задаток (рублей)
1	д. Силичи, ул. Васильковая, д. 6, 623284605401000305	0,1021	водоснабжение, газоснабжение	27 484 700	14 576 100 + реклама	2 748 500
2	д. Понизовье, ул. Руднянская, д. 1, 623284604601000148	0,1400	водоснабжение	25 110 900	13 449 700 + реклама	2 511 100
3	д. Пархово, У-5, 623284604501000064	0,1504	электричество	30 876 400	5 865 100 + реклама	3 087 700

Земельный участок в д. Силичи, ул. Васильковая, д. 6 имеет ограничения в использовании площадью 0,1021 га в связи с расположением в водоохранной зоне пруда и земельный участок в д. Понизовье, ул. Руднянская, д. 1 имеет ограничения в использовании площадью 0,1400 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна и площадью 0,0112 га в связи с расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт.

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Аукцион состоится 30 марта 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений – **24 марта 2016 года до 17.00.** Контактные телефоны: **(801774) 55056, 55473.**

Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий льнозавод»

24 марта 2016 г. в 15.00

СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Слуцкий льнозавод»

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год и основных направлениях деятельности Общества в 2016 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества о работе в 2015 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2015 год.
3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 8 (308)

«Поўня».

■ Падзея месяца

Мне вельмі патрэбен твой горад

Нашы стыхіі. Адзінокія хаткі ў абсалютна натурных бязлюдных «дэкарацыях» і жывыя гарадскія вуліцы. Тут расчыненыя вокны, што дазваляюць нам знаходзіцца на памежжы ўтульнай адзіноты і гучнай весялосці; матывы Вавілонскай вежы, якая раз'ядноўвае людзей; палётаў над горадам Марка Шагала, што ўзвышае чалавека над абставінамі. Карціны гродзенскай мастачкі Вікторыі ІЛЬІНОЙ даюць магчымасць адчуць любую стыхію — на свой густ. У гэтым месяцы ў «Галерэі Мастацтва», што на праспекце Незалежнасці, два тыдні праходзіла яе выстаўка. Без афіцыйнай цырымоніі адкрыцця, інтэрв'ю і прамоў калег.

Стыхія — паняцце глыбока асабістае. Мы яе для сябе вызначаем, і яна нас вызначае, накладае адбітак, становіцца фонам нашых уяўленняў і мар. Я люблю гарады з карцін Вікторыі Ільіной — мае гарады. Нашы гарады — гледачоў. Што мы адчуваем сярод ліхтароў? Які з гэтых тысяч агней — поўня? Якія гісторыі набываюць свой апафеоз за гэтымі вокнамі? Дзе тут наша месца? Якія б адказы ні былі, героі — мы з вамі.

Тады ўяўленні і мары пад музыку Пятра Чайкоўскага альбо Клода Дэбюсі атрымліваюць, хай і часова, свой антураж — так спрацоўваюць карціны мастачкі, нечым падобныя на ажыўленыя, густыя, выразныя творы Пітэра Брэйгеля. Той таксама меў цікавасць да гарадскіх вуліц і, дарэчы, Вавілонскай вежы.

Толькі пад поўняй Ільіной заставацца лягчэй, чым у стракатым, змрочным, панурым брэйгелеўскім свеце. Магчыма, таму, што тут больш асабістага, і для гледача таксама (праўда, колеры работ мастачкі яшчэ варта прааналізаваць на прадмет змрочнасці і настрою ўвогуле). «Стыхіі» на палотнах аўтаркі — як здараецца, калі сустракаеш «сваё», — адгукаюцца на падсвядомым узроўні. Рэфлексіўна рэагуюць ужо сфарміраваныя фантазіі і нітачкамі звязваюцца з гатовым месцам падзей, каб узаемадапоўніць адно аднаго.

Вядома дакладна: эмацыянальна адчуць твор — значыць не проста ўкласці ў эфемерную асабістую эвалюцыю, але атрымаць практычны эфект.

«Якая надзвычайная прастата адмаўлення!» — сказала на нейкай выстаўцы гераіня аднаго з фільмаў Вудзі Алена. Перад палатном Вікторыі Ільіной не трэба быць снобам, каб вымушаць сябе адшукаць шматпавярховыя характарыстыкі, — трэба толькі адчуваць. Калі падключаецца свядомасць, складаныя механізмы мыслення рыхтуюць успаміны з ажыўленых вуліц і момантаў, калі вы наўмысна іх пазбягаеце, схаваўшыся ў чатырох сценах (так бывае ў кожнага, згадзіцеся). Усе звязаныя з гэтым думкі, надзеі ў невыразных размытых малюнках і планы — найлепшыя — абуджаюцца і разліваюцца па целе. Нефізічнае ўвасабляецца ў фізічным.

Эмоцыі — напэўна, галоўнае, што мы можам узяць ад мастацтва. Праўда, адчуць і зразумець яго — настолькі ж складана, як вызначыць адказы на вечныя, ужо немагчыма трывіяльныя, пытанні.

У першую чаргу пытанні мастацтва — што яно ёсць, калі становіцца фальшывым, і ці насамрэч чалавеку патрэбна? Дапусцім, адказам на апошняе можа стаць толькі аксіёма — дакладна патрэбна, і тым таксама, хто яго стварае. Два іншыя — настолькі ж вечныя, наколькі невырашальныя. Невядома, ці абавязкова вызначэнне адказаў на гэтыя пытанні становіцца пераходам на прынцыпова новы — вышэйшы — узровень уласнай эвалюцыі. Як тэалагічныя ўзроўні са схемы псеўдарэлігіі саенталогіі, створанай амерыканцам Ронам Хабардам, дзе за шлях угору трэба было выкласці круглую суму. Затое вядома дакладна: эмацыянальна адчуць твор — значыць не проста ўкласці ў эфемерную асабістую эвалюцыю, але атрымаць практычны эфект. Якое ўздзеянне гэта будзе мець на жыццё — яшчэ адно невырашальнае пытанне. Мастацтва — падсвядомасць — свядомасць — успаміны — мары. Варта папрактыкаваць.

Мастачка Вікторыя Ільіна, член Саюза мастакоў, у свой час скончыла аддзяленне станковага жывапісу Беларускай акадэміі мастацтваў. Як і любы знакавы аўтар, удзельнічала ў замежных выставах — у Францыі, Іспаніі, Польшчы, Расіі. Для гэтага тэксту важней усё ж узгадаць не пра колькасць выставак, а той факт, што яна выкладае ў дзіцячай мастацкай школе.

Пад поўняй Ільіной заставацца лягчэй, чым у стракатым, змрочным, панурым брэйгелеўскім свеце. Магчыма, таму, што тут больш асабістага, і для гледача таксама.

Вядома ж, яе навучэнцы будуць ведаць, хто такія Марк Шагал і Пітэр Брэйгель. Будуць разумець, што выяў дамоў, дрэў і людзей недастаткова для адлюстравання горада. Магчыма, яны будуць ведаць, што такое сапраўднае мастацтва і як атрымаць ад яго практычны эфект. Я ж падумаю пра гэта заўтра.

Выстаўка прайшла, карціны, на шчасце, засталіся. Бо нам вельмі патрэбны гэтыя гарады. Нашы гарады.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ На сцэне

НАСТРОЙ РУХУ

Тэатр у пошуку ідэй і форм выказвання

Нерухомасць — складаны стан для чалавека. Паспрабуйце доўга сядзець не зварухнуўшыся, не круціць галавой, склаўшы рукі пры сабе... Ну, здранцвеюць жа. Чалавеку, каб адчуваць сябе жывым, патрэбен рух. І нават калі ў нерухомасаці знаходзіцца цела, у ім усё адно ідуць нябачныя працэсы жыцця — рух крыві і рух думак. Таму мы чакаем руху і ад мастацкіх з'яў: калі прыходзяць новыя ідэі і выяўляюцца ў пошуку адпаведных формаў выказвання.

Фота Марыі ВОЙЦІК

«ДК Данс — Рытуал развітання» мінскага пластычнага тэатра «ІнЖэст».

Сам чалавек — яго цела і рухі — гэта таксама форма, у якой увасоблена ідэя. Але адначасова і сродак выказвання. Чацвёрты адкрыты форум эксперыментальных пластычных тэатраў «Пластформа» яшчэ раз паспрабаваў выявіць энергію руху ў беларускім тэатры новага стагоддзя. Жывое і чулае мастацтва адлюстроўвае грамадскія працэсы, таму і прываблівае.

Падаць і ўзнімацца

Для кагосьці тэатр — найперш свята. Нешта накшталт вясёлага баўлення часу сярод умоўнасцяў і прыгожых гарнітураў. Такі карнавал...

Карнавал панаваў на адкрыцці фестывалю: тэатр «ІнЖэст» паказваў адзін са сваіх самых гучных спектакляў «ДК Данс». Усё як належыць: маскі і людзі на хадулях. У зале, сярод людзей, — артысты ўключаюць іх у сваю дзею. Як жа гэта цудоўна: адчуваць дзіцячую бесклапотнасць, радасць, проста ад таго, што ты ўключаешся ў свята. Артысты правакуюць — і вось ужо ў некага пачуццё дыскамфорту, хоць нам нічога такога і не гавораць. Слоў няма. Ёсць рухі. Але яны не адлюстроўваюць рух. Якраз наадварот.

Перад намі супольнасць людзей, якія імкнуцца жыць бесклапотна. Да нейкага моманту ў іх гэта атрымліваецца. Але грувасткія «карнавальныя» хадулі — штучныя ногі — не для любых рухаў, не для кожнага рытму. Калі збіцца і ўпасці, то яны ператвараюцца ў кайданкі: можна адно поўзаць, марудна і пакутліва пераадольваючы адлегласці. Гэта толькі здаецца, што марудны рух патрабуе меней высілкаў. Зусім наадварот: энергія ідзе на пераадоленне таго, чаго магло б і не быць. І тады ахінае адчай. Затым прыходзіць жаданне пазбавіцца ад штучных карнавальных атрыбутаў — падпілаваць свае падпоркі. Жаданага выніку гэта не прыносіць: частковае адсячэнне непатрэбнага прымушае хіба што кульгаць. Які тут рух? Адзінае выйсце — стаць сабой, не скаваным нічым, чыстым чалавекам, які ў свабодным целе вучыцца хадзіць сам...

Тыя, хто сочыць за спектаклямі тэатра «ІнЖэст», ведаюць, што «жэст» у іх заўсёды адлюстроўвае ідэю. Спектакль «ДК Данс» быў створаны на мяжы стагоддзяў, і цяпер яго вырашылі адправіць у гісторыю — апошні паказ быў падчас фестывалю. Прычыны, відаць, усё ж тэхнічныя: гэты перформанс створаны пад іншую пляцоўку, сцэна Палаца культуры чыгуначнікаў, дзе адбываўся апошні паказ, хоць і мае сувязь з назвай пастаноўкі, аддаляе яе ад гледача. На самай справе вялікая частка гэтага перформансу, закладзеная аўтарам і галоўным выканаўцам Вячаславам Іназемцавым, — у поўнай уключанасці ў карнавал усіх прысутных. Жыццё можна ўспрымаць як карнавал, але толькі праз балючае падзенне разумееш, што ўзнімацца трэба для таго, каб вучыцца стаяць на нагах трывала, пажадана не абцяжарваючы сябе карнавальнымі маскамі і мішурой.

Дзіўна, але вось гэты зусім не новы спектакль усё яшчэ не страціў сваёй актуальнасці для Беларусі — ні ў дачыненні да агульначалавечай ідэі, ні ў дачыненні да тэатра. І калі праз

Беларускі перформанс «Імправізацыя без сакрэтаў» Міхаіла Камінскага.

пятнаццаць гадоў пасля стварэння яго ўсё яшчэ ўспрымаюць як авангардны, то можна меркаваць пра рух і рытм тэатральнага працэсу ў нашай краіне. Дзеля таго, каб яго актывізаваць, і з'явілася думка правадзіць «Пластформу». Добрая. Здавалася, вось цяпер увесь пласт ідэй, якія недзе глыбока віруюць, выбухне ў самых розных тэатральных формах.

Узняцца і ісці

Некалькі дзён «Пластформы» былі прысвечаны менавіта беларускім пастаноўкам. О, у нас іх на некалькі дзён — значыць, ёсць той самы пошук спосабаў выяўлення ідэй праз форму.

Форму не столькі шукаюць, бо яна ўжо была знойдзена: перформанс, па-сутнасці сваёй даволі пластычны, да таго ж сінкрэтычны, калі выканаўцы (артысты, мастакі — творцы) выказваюцца праз дзею. Але галоўнае тут — не сама па сабе мова целаў, а больш думка, якая павінна быць наперадзе. Гэта не толькі харэаграфія, і не зусім драматычны тэатр, не пантаміма, не сам па сабе вонкавы вобраз, прыдуманы мастаком. Цела — фарба, штрых, лінія, літара. Знак, ці сістэма знакаў, якія могуць перацякаць адзін у ідзін, змяняць адзін аднаго, удакладняць, сплятацца ў тэкст. Глядач у такім тэатры счытвае сімвалы, робіць з іх выснову. Усё адно, што разгадвае шараду. З ім гуляюць: зразумей, адчуй, уяві. Адлегласць паміж месцам прадстаўлення і залай умоўная, таму што інтэрактыў прадугледжваецца. Калі яго няма — атрымліваецца шоу для старонніх назіральнікаў, якія разважаюць катэгорыямі: «спадабалася» — «не спадабалася», нібыта ацэньваюць забаўку. І тады тэатр сапраўды як карнавал.

Гэта я да таго, што, калі іду на сучасную пастаноўку, чакаю запрашэння да размовы. Калі размаўляюць на мове цела, то так ці інакш зададзены асноўны тон — чалавек, яго сутнасць, яго стан, перажыванні, пачуцці, яго адчуванне свету, яго ўключанасць у жыццё альбо нават выключанасць — і гэта, на жаль, рыса часу, якая патрабуе мастацкага асэнсавання.

Жаданне асэнсоўваць ёсць. Напрыклад, у магіляўчан з Laboratory Figures Oskar Schlemmer. Вядомы ўжо калектыў прадставіў перформанс «I'm OK» (аўтар Настасся Лапніцкая), дзе якраз і гучала думка, як адысці ад атракцыёна і навязаных звонку карцінак, якія падаюць ілюзію жыцця: чалавек пачуваецца самотным. Так, у гэтай тэме выказванне праз пластыку — выдатны спосаб прадзірацца да свядомасці, узрушыць. Гэта не значыць, што перформанс — маўклівы. Але словы, як ні дзіўна, могуць выконваць функцыю антуражу, дэталізацыі ці ўносяць акцэнт. Сэнс вы бачыце (ён можа быць візуалізаваны з дапамогай тэхнічных сродкаў, экрана): можна навучыцца правільна цалаваць з дапамогай інструкцыі са слоў. Спроба вучыцца цалавацца па інструкцыі ілюструе драму сучаснага і вельмі прасунутага індывіда. Чалавек злiваецца са штучнай выявай у тэарэтычным пацалунку...

Пра пошук блізкасці разважалі ў перформансе школы танца SkyLine з Мінска, на мове танца яна выглядала ў спалучэнні рухаў у пэўным рытме. Танец — гэта нам усё ж больш зразумела, можа таму спробы рабіць перформансы часта патанаюць выключна ў выбудоўванні малюнку рухаў. І тады форма фактычна замяняе сэнс. Аўтары і выканаўцы ідуць услед за формай. Яна іх зацягвае. У пастаноўцы «Intro» тэатра танца «ОтражениЯ» з Мінска. Зрабіць эфектна для нас больш істотна. Таму часта выкарыстоўваюцца дадатковыя спецэфекты, напрыклад, тая ж візуалізацыя на экране. У прыватнасці, у перформансе «Зерне» Сяргея Паяркава, у выкананні Ігара Чыпоўскага, які, трэба думаць, шукаў зерне сэнсу.

Без пафасу, але па-чалавечы цёплым атрымаўся паказ пастаноўкі «Правінцыя» Тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанкі. Відаць, існаванне ў Віцебску, дзе праходзіць міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, паўплывала: разуменне, што рабіць і як спалучылася з тэмай. Замалёўкі з гарадскога жыцця, дзе праглядаюцца і характары, і сітуацыі, вельмі пластычна трансфармуюцца мізансцэны, вобразна агучаны (толькі рухамі!) сюжэт, дзе ўсё пазнаецца. Вось спакусніцы з апельсінамі. Вось мужчыны свабодныя, потым мужчыны на вяроўцы, а потым — нібыта штангі пад вяроўкі для бялізны, а гаспадыні тут як тут, развешваюць... Спатканні і расстанні. Не толькі ў правінцыі так: людзі, дзе б яны ні жылі, імкнуцца знайсці свой лёс і ўладкаваць побыт. Пачуцці актуальныя заўсёды і паўсюль. Таму і тэма кахання Экзюперы яшчэ аднаго пачуццёвага спектакля «Поры года» гэтага ж аўтара. Нешта па-за часам спрабавала зварыць выканаўца перформанса «Было — не было» тэатра «Галерэя» (Гродна). У вольнай форме пра адвольнае — пра ўсё, што ў дадзены момант можа быць на душы ў кожнага канкрэтнага гледача.

Ісці... Ісціна?

Гэтаксама трактаваць можна было і паказы двух сумесных праектаў, прадстаўленых на «Пластформе». «Лабараторная работа №19.9»: беларуска-ўкраінскі праект. Іна Асламава (гомельскі гурт сучаснай харэаграфіі «Квадра») і Данііл Белкін з Днепрапятроўска праводзілі сумесную лабараторыю. Вынік працы яе ўдзельнікаў і быў прадэманстраваны. Выглядала гэта як лабараторыя па даследаванні чалавечага цела. Якому патрэбны пункт апоры. Ці не патрэбны... Хаатычныя рухі асобнага цела ці сінхранізаваныя — у групе. Ці яна распадаецца, ці зноў сыходзіцца і ходзяць зладжана. Падобна, што для нас усё яшчэ больш актуальна навучыцца эфектнай дакладнасці рухаў. Тое ж было важна і ў спектаклі студэнтаў кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пад кіраўніцтвам польскага пастаноўшчыка Мацея Кузьмінскага яны стварылі дзею пад назвай «Пасля Да». Хадзіць разам, спыняцца разам, сядзець разам, маўчаць, вытрымліваць паўзы, узнімацца, зноў маршыраваць. Гэта важна ўмець рабіць, што дэманструюць тыя ж замежныя госці (сёлета шмат было польскіх пастановак). Але гэта тое, што ўжо даўно не эксперымент, а звычайны навык, дасягнуты шляхам трэніровак. А вось яны патрэбныя для таго, каб ісці далей.

Шукаць тое, што сапраўды павінна ісці «пасля» рухаў. Што павінна прывесці да думкі. Пакуль да думкі прыходзіць сам глядач, і ад ступені яго вобразнага мыслення ці розуму вельмі часта залежыць тое, што ён убачыць і зразумее. І гэта, бадай, галоўны эксперымент, які быў навідавоку ў беларускіх перформансах. Таму што сама форма, якая для нас падаецца ўсё яшчэ эксперыментальнай, у свеце ўжо даўно аксіёма (гэта дэманстравалі госці з-за мяжы). Нашы тэатры (большасць) нібыта імкнуцца зрабіць як у іх, замест таго, каб сапраўды шукаць сябе і эксперыментаваць. Таму што сэнсы пошукаў нават у чалавечай прасторы «там» і «тут» палягаюць наогул у розных плоскасцях, як і розныя сэнсы гэтых пошукаў. Прынамсі, з пазіцыі гледача.

З пазіцыі гледача хочацца, каб думка была. І «да». І «пасля». Таму мне асабіста вельмі шкада, што сыходзіць прадуманы «ДК Данс». Танец карнавальнага жыцця, якое дасягнула ўпадку і не можа ўзняцца. Не ведае, як. Бо для гэтага патрэбны высілкі, а не спробы. Але ж у тэатры — як у жыцці, і наадварот. І ёсць адчуванне, што хочацца руху.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■

Извещение о проведении 11 марта 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№	Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Местонахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	**помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м**	г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25	5 908 912 800	59 000 000
2.	**административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м**	г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27	18 792 732 000	1 500 000 000
3.	**административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м**	г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26	246 281 280	24 000 000

Продавец имущества: ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.

Организатор торгов: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунальное унитарное предприятие *«Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **11 марта 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.02.2016 по 09.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

■ Выстава

«Стварэнне Адама» — стварэнне свету

Работы мастакоў эпохі Адраджэння паказваюць у Мінску

Калі магчыма выказаць словамі геніяльнасць і значэнне Мікеланджэла Буанароці для сусветнага мастацтва, то менавіта так: Мікеланджэла — гэта ідэал, гэта абсалют, гэта бог. Тым цяжэй усведамляць, што творы яго рукі — вядома, я не маю на ўвазе яго санеты — рэдка можна ўбачыць зблізку. Асабліва гэта тычыцца Сіксцінскай капэлы, алтарная сцяна і столь якой яшчэ ў XVI стагоддзі былі распісаны майстрам. І нават пяціметровая статуя Давіда, выстаўленая ў Акадэміі выяўленчых мастацтваў у Фларэнцыі, адкрываецца гледачу не паўнавартасна, бо асобнай увагі тут заслугоўвае выраз твару героя перад бітвай з Галіяфам. Трапіць у Мінск гэта спадчына генія Адраджэння магла толькі ў адным выглядзе — у якасці мультымедыйнай выстаўкі «Мікеланджэла. Стварэнне свету», што 18 лютага адкрылася ў крэатыўнай прасторы ЦЭХ.

Уявіце, як класічнае акадэмічнае мастацтва вядомага скульптара эпохі Адраджэння, мастака і паэта («Я думкамі скіраваны ў вечнасць...»), што абапіраўся ў творчасці на антычную спадчыну, са шчырай верай у Бога выконваў заказы каталіцкай царквы і сям'і Медычы, з патрабавальнай унікальнасцю адбіраў для сваіх скульптур найлепшы мармур, працаваў ад світання да світання, дысануе з заводскай пабудовай на мінскай Кастрычніцкай вуліцы, дзе і размешчана выставачная прастора ЦЭХ. І хоць мостам тут служаць сучасныя тэхналогіі — віртуальны свет, які рэпрэзентуе творчасць мастака, — выглядае гэта незвычайна.

Асучасніванне, змяненне фармату, выкарыстанне твораў класічнага аўтара ў папулярнай форме спрацоўваюць — на такое шоу з вялікай ахвотай прыходзіць розныя людзі і, здавалася б, далёкае мастацтва становіцца даступнейшым і больш блізкім.

Месца правядзення абумоўлена не ў апошнюю чаргу тэхнічнымі акалічнасцямі: ЦЭХ валодае патрэбнай плошчай, каб размясціць апаратуру, і вялікімі сценамі для экранаў, на якіх з дапамогай праектара пад музыку Баха, Шуберта, Гендэля паказваецца аудыёвізуальнае шоу працягласцю ў сорак хвілін.

Асноўнай часткай праграмы з'яўляецца роспіс Сіксцінскай капэлы, ад Стварэння свету да Страшнага суда — шлях, які ў адпаведнасці з Бібліяй павінна прайсці чалавецтва. У рэальнасці ён займае каля пяцісот квадратных метраў, змяшчае каля трохсот фігур. На выстаўцы можна ўбачыць таксама скульптуры Мікеланджэла — «П'ету», «Давіда», «Маісея»; у шоу ўключана творчасць іншых аўтараў эпохі Адраджэння — Леанарда да Вінчы і Рафаэля (яны разам з Буанароці ствараюць тройцу тытанаў эпохі), Батычэлі, Тыцыяна і Джота.

Не так даўно на той жа пляцоўцы таксама ў фармаце мультымедыйнай выстаўкі былі паказаны творы Вінцэнта Ван Гога. Хто ці што тут — «галоўны экспанат», тады прыйшло вызначыць у цэлым каля трыццаці тысяч чалавек. Праект «Мікеланджэла. Стварэнне свету» стаў другім такім вопытам для выставачнага жыцця Беларусі.

Выкарыстанне мультымедыйнага фармату выводзіць мастацтва ў іншую катэгорыю, і класічны аўтар становіцца модным.

Дысананс паміж «антычнымі» фігурамі і бетоннай падлогай становіцца ў пэўным сэнсе паказчыкам часу. Па-першае, тут праяўляюцца магчымасці, якія дае нам выкарыстанне сучасных тэхналогій. Паглядзець на роспіс Сіксцінскай капэлы не на здымках у кнізе і не ўглядаючыся ў звод ватыканскага храма — напэўна, дарагога каштуе. Па-другое, выкарыстанне пэўнага фармату выводзіць мастацтва ў іншую катэгорыю, і класічны аўтар становіцца модным.

Мультымедыйныя выстаўкі, даўно знаёмыя сусветным пляцоўкам, — фармат, пагадзіцеся, папсовы. А гэта яшчэ адзін дысананс і нават аксюмаран (сумяшчэнне несумяшчальнага), схаваны ў віртуальным туры «Мікеланджэла. Стварэнне свету» (ён, дарэчы, як і з творамі Ван Гога, з поспехам прайшоў у Маскве і іншых гарадах).

Асучасніванне, змяненне фармату, выкарыстанне твораў класічнага аўтара ў папулярнай форме спрацоўваюць — на такое шоу з вялікай ахвотай прыходзяць розныя людзі, і, здавалася б, далёкае мастацтва становіцца даступнейшым і больш блізкім. Нарэшце, выстаўка мае і функцыю лікбезу. Арганізатары мяркуюць, што «Стварэнне свету» будзе папулярней за «Ажыўшыя палотны» Ван Гога, а гэта значыць, вялікая колькасць людзей даведаецца, што Мікеланджэла — не толькі аўтар накіраваных адна да адной рук з фрэскі «Стварэнне Адама» (адсылка да якой ужо стала мэйнстрымам), але і найвыдатнейшы скульптар, таленавіты паэт.

Выстаўка працуе ў ЦЭХу да 17 красавіка. Наступным аўтарам, які будзе прадстаўлены ў падобным фармаце ў Мінску, як плануецца, стане галандскі мастак Іераним Босх.

Фота Надзеі БУЖАН.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

Больш фотаздымкаў шукайце на сайце zviazda.by

■ Экслібрыс «Звязды»

Ігнатавы пуцявіны

Юры Станкевіч. Паўночны вецер для спелых пладоў. — Мінск: Галіяфы, 2015. — 248 с.



Прозу
Юрыя Станкевіча
заўсёды чытаць
няпроста.
Ён згушчае фарбы,
аддаючы перавагу
цёмным адценням,
малюе брутальныя
і наўмысна
грубыя вобразы,
нібыта высякае
іх з граніту,
піша вялікімі і крыху неахайнымі мазкамі.
Але ідэі, думкі, якія, як травінкі, прабіваюцца праз глыбы і слаі аўтарскага ўяўлення, паказваюць нам іншы бок твораў.
Падкрэсліваюць крохкасць і неверагодную істотнасць шчасця і гармоніі,
суладзяя з усім светам і з самім сабой.

Вось і ў новай кнізе твораў Ю. Станкевіча, загалоўным для якой стаў раман «Паўночны вецер для спелых пладоў», на першы план зноў выходзіць чалавек, здольны супрацьстаяць цяжкасцям існавання, які ўмее па цаглінках будаваць свой характар, сваю «самасць». Папярэдне мяркуючы па аб'ёме рамана — усяго 116 старонак, — чытач можа здзівіцца аўтарскаму вызначэнню жанру. У беларускай літаратурнай традыцыі такі твор сціпла назвалі б аповесцю. Але ж у дачыненні да гэтага тэксту варта кіравацца не колькасцю старонак, а значнасцю падзей у жыцці герояў. Тут мы назіраем, як за кароткі тэрмін — усяго два гады навучання ва ўніверсітэце — галоўны герой рамана Ігнат з інфантыльнага студэнта ператвараецца ў смелага мужчыну, здольнага будаваць сваё шчасце і змагацца за свае перакананні.

Так, з галоўным героем рамана Ігнатам Мазурам чытач сустракаецца ў адзін з пераломных перыядаў яго жыцця. Гэта час, калі навучэнец філфака вырашыў усё ж выбраць прафесію журналіста і, скарыстаўшыся магчымасцю, перавёўся на адпаведны факультэт. А тут усё па-іншаму. Многа студэнтаў з замежжа, шмат тых, хто мае грошы і знаходзіцца ў сваяцкіх стасунках з кіраўніцтвам... Сціпламу Ігнату, ураджэнцу беларускай глыбінкі, якога цяжкахворая маці выхоўвала адна, даводзіцца не проста прыстасоўвацца да навакольля, заводзіць новыя знаёмствы, але і шукаць сябе.

Здаецца, празаік наўмысна выпрабоўвае свайго героя на трываласць, нібыта назірае за тым, ці здолее ён справіцца са складанымі калізіямі, захаваць твар і зберагчы ўласную годнасць. Бясконцыя экзамены па прадметах, якіх Ігнат не разумее і нават не імкнецца зразумець, канфлікты з аднагрупнікамі, нават арышт на трое сутак... Халодны паўночны вецер, які служыць сімвалам жыццёвых выпрабаванняў і пакут, з кожнай наступнай старонкай становіцца ўсё больш і больш марозным, ператвараючыся ў сапраўдны сівер. Здаецца, што Ігнат не знойдзе ў сабе сілы, каб жыць далей, адшукаць каханую ў далёкім горадзе і разам з ёй наладзіць дабрабыт.

Бо ці магчыма студэнцкія гады ўявіць без кахання, стасункаў, якія могуць скончыцца адразу па атрыманні дыплома, а могуць доўжыцца і ўсё жыццё? Вось перад Ігнатам, якому надзвычай лёгка закахацца ў прывабную дзяўчыну, напрыканцы навучання ва ўніверсітэце паўстае выбар: Юля ці Света? Бесклапотнае жыццё з забяспечанай сям'ёй будучай жонкі ці фінансавая нявызначанасць, але прысутнасць самага блізкага чалавека?

Разам з Ігнатам чытач не толькі намацвае жыццёвы шлях, але і разважае, вучыцца. Ён спасцігае модныя філасофскія і біялагічныя тэорыі. Напрыклад, пра тое, што галоўнае ў існаванні чалавека — энергія зорак, якая запаўняе ўсё на свеце. Што вучэнні Маркса і яго «Капітал» не маюць нічога агульнага з жыццём і яго вартасцю... Часам галоўны герой настолькі глыбока заблытваецца ў павуцінні ўласных страхаў, разважанняў і сумненняў, што знайсці выйсце яму дапамагае толькі... дзённік. І сапраўды, запісы, якія студэнт Ігнат міжволі робіць у сваім нататніку, дзе сам сабе распавядае пра падзеі з мінулага, спрабуе адшукаць рашэнне актуальных пытанняў, нават пераказвае падзеі жыцця, становяцца тым неабходным ключом да разумення рэчаіснасці.

Халодны вецер з поўначы можа прынесці хваробы і клопаты, а можа стаць неверагодным натхненнем, чыстым глыткам свежага паветра. Вось і Ігнату Юрый Станкевіч не проста падрыхтаваў комплекс пакутлівых момантаў, але прывёў яго да разумення: часам у жыцці важна зрабіць наступны крок і працягваць жыць, бо ёсць толькі адна сапраўды істотная жыццёвая сцежка. Трэба яе намацаць — і смела крочыць далей.

Марына ВЕСЯЛУХА

■ Постаць

КАНЦЭРТ ДЛЯ АДНАГО ГЛЕДАЧА

Гісторыя сяброўства Уладзіміра Мулявіна і фотамастака Юрыя Іванова

Учора ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася выстаўка Юрыя Іванова «Невядомыя фотаздымкі Уладзіміра Мулявіна».

На гэтых рэдкіх і ўнікальных кадрах — не проста імгненні з жыцця Уладзіміра Георгіевіча, моманты канцэртных выступленняў легендарных «Песняроў», але і сведчанні сяброўства двух мастакоў: музыканта і фатографа. Сёння спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а ў 1970-я гады фотакарэспандэнт «Агенцтва друку «НАВІНЫ» (АДН), Юрый Іваноў воляю лёсу стаў сапраўдным летапісцам гісторыі «Песняроў». Працуючы доўгія гады поруч, але па розныя бакі фотааб'ектыва, Уладзімір Георгіевіч і Юрый Сяргеевіч сапраўды пасябравалі.

Гісторыю свайго сяброўства з Уладзімірам Мулявіным і «Песнярамі» Юрый Іваноў распавядае ахвотна і з вялікай цеплынёй. Ён кажа, што любы фотакарэспандэнт — чалавек, які ўваходзіць у дом да незнаёмага героя. Ён можа выйсці, як і быў, чужаніцай, але ёсць магчымасць ператварыцца ў сябра. У выпадку з «Песнярамі» так і адбылося:

— У тыя часы, калі пазнаёміўся з Уладзімірам Мулявіным, я працаваў у «Агенцтве друку «НАВІНЫ» (сёння «РИА Новости»). Цэнтральная рэдакцыя знаходзілася ў Маскве, і менавіта адтуль я атрымаў заданне напісаць пра «Песняроў». Гурт яшчэ толькі пачынаў сваю дзейнасць, але цікавасць да яго ўжо ўзнікла, нават з Амерыкі, дзе мы выдавалі часопіс Soviet Life, пачалі задаваць пытанні. Тады я і пазнаёміўся з Мулявіным. Гэта было ў 1973 ці 1974 годзе. Хадзіў на канцэрты «Песняроў», прысутнічаў на іх рэпетыцыях у філармоніі, рабіў фотаздымкі, друкаваў іх у лабараторыі і дарыў удзельнікам гурта. Ім падабалася. Менавіта праз фотаздымкі я ўвайшоў у калектыў, стаў амаль што яго «летапісцам», таварышам па мастацтве.



Уладзімір Мулявін, 1999 год.

Той самы першы матэрыял надрукавалі ў Маскве, ЗША і іншых краінах, у выданнях, што рыхтавала АДН. А фотамастак ужо ведаў: «Песняры» — яго сябры. Гэта пацвярджалася і стаўленнем музыкантаў гурта да яго асобы:

— Была адна гісторыя: мне трэба было зрабіць фотаздымак гурта на сцэне, не канцэртны, пастановачны. Мы выбралі час, гэта было ноччу, калі сцэна філармоніі вольная. Выйшлі ўсе ўдзельнікі ансамбля ў касцюмах, з інструментамі. Я разумеў, што проста так, без музыкі, добрае фота не атрымаецца. І тут Мулявін кажа: «Дык што, табе можа яшчэ і заспяваць?» А для гэтага трэба было падключыць апаратуру, мікрафоны, інструменты...

Я нясмела кажу: «Так...» і сам баюся, што Мулявін адмовіцца, выганіць з залы. Але ён адказаў: «Добра. Якую песню заспяваць?»

Я стаяў перад вялікім выбарам... Але не мог не згадаць сваю любімую песню на словы Максіма Танка — «Завушніцы». І можаце сабе ўявіць, якая гэта была праца: для мяне аднаго на сцэне філармоніі «Песняры» выконвалі маю любімую песню! Я дагэтуль памятаю той момант. Фатаграфаваў, не спыняючыся. Дарэчы, адзін са здымкаў з той серыі «Песняры» пазней выкарысталі ў афармленні вокладкі пласцінкі-гіганта. Пачалося сапраўднае сяброўства з усім гуртом: Анатолем Кашапаравым, Леанідам Барткевічам, Уладзіславам Місевічам... Я ўжо быў сваім чалавекам.

Здаецца, што за кожным фотаздымкам, прадстаўленым на выстаўцы, хаваецца свая захапляльная гісторыя. Тое, як яны рабіліся, Юрый Іваноў памятае ў дэталях. Вось, напрыклад, як нараджалася знакамітая серыя, дзе «Песняры» імчацца на санях, запрэжаных тройкамі коней, па заснежаным полі:

— Ішоў снежань 1980 года, я працаваў над альбомам пра Мсціслаў. Горад мне вельмі спадабаўся. Людзі выдатныя, і там ёсць унікальны конезавод, дзе гадуюць цяжкавозаў. Звярнуўся да дырэктара, запытаўся, ці ёсць у іх тройкі, ці можна іх запрэгчы для здымак і сфатаграфаваць у такім вобразе, да прыкладу, ансамбль «Песняры». Ён узрадаваўся! І Мулявін на маю прапанову пагадзіўся, якраз у канцэртным графіку былі вольныя дні. Мы прызначылі дату, у Мсціславе развесілі афішы, анансавалі канцэрт, дамовіліся пра сустрэчы.

За некалькі дзён да прызначанай даты я завітаў у філармонію і нагадаў пра паездку. А Мулявін кажа: «Не, мы не паедзем. Атрымалі прапанову з Адэсы якраз на гэтую дату. Там абяцаюць добрыя грошы». Я нічога не змог адказаць... Магчыма, Мулявін прачытаў усё ў маім поглядзе: і боль за сваю працу, за падрыхтаваных жыхароў Мсціслава... І ён кажа свайму дырэктару: «Пішы тэлеграму ў Адэсу, што мы ўсе захварэлі».

Якая была сустрэча ў Мсціславе! Сапраўднае свята. Здымкі прайшлі проста выдатна. Запрэглі коней, «Песняроў» апранулі ў адмысловыя кажухі, зіма была незвычайна прыгожая... А сама праца праходзіла так: калі фатаграфаваў, я стаяў на кузаве грузавіка, які ехаў перад тройкамі з «Песнярамі», каб не ўпаў, мяне трымалі некалькі чалавек.

У гэтай гісторыі ёсць і цікавы працяг. Пасля Мсціслава «Песняры» паехалі ў Лацінскую Амерыку з гастролямі. Калі яны вярнуліся, Юрый Іваноў пры сустрэчы з Мулявіным запытаўся пра ўражанні, на што Уладзімір Георгіевіч адказаў: «Ды што Лацінская Амерыка, як там Мсціслаў?»

Лёс склаўся так, што менавіта Юрый Іваноў у 1999 годзе зрабіў апошні яркі фотапартрэт Уладзіміра Мулявіна, ён лічыцца і адным з найлепшых. У поглядзе Уладзіміра Георгіевіча — незвычайная цеплыня, шчырасць і давер.

— Для фотакарэспандэнта важнае значэнне можа мець любая цікавая дэталь, — тлумачыць Юрый Іваноў. — Памятаю, у той дзень я прыйшоў у філармонію, Мулявін сядзеў за сваім сталом. Я заўважыў проста неверагоднае святло ад акна і папрасіў Валодзю паглядзець на мяне. Так, партрэт сапраўды незвычайны. Магчыма, справа ў тым, што мы з ім былі не проста знаёмымі, але і сябрамі, калегамі па творчасці.

Падчас рэпетыцыі, 1975 год.

Памятаю, што менавіта ў той дзень я запытаўся ў Мулявіна, колькі яму гадоў. Мы ўжо досыць доўга былі знаёмыя, але дакладнага ўзросту сябра я не ведаў. Ён назваў год свайго нараджэння, 1941-ы, я крыху здзівіўся: на некалькі гадоў маладзейшы за мяне. На што Мулявін усміхнуўся і дадаў: «А ты што, думаў, што я равеснік Янкі Купалы?».

Наша сяброўства было вельмі цёплым, шчырым, было разуменне творчасці, павага. У адным толькі не меў рацыі: калі «Песняры» яшчэ пачыналі сваю кар'еру, наглядзеўшыся канцэртаў «Бітлоў», я і ад іх чакаў нейкага яркага выступлення, танцаў, рухаў. А Мулявін, пачуўшы прапанову папазіраваць, жартоўна нешта паказаць, паглядзеў на мяне са шкадаваннем і кажа: «Мы не артысты, мы музыканты». І гэта сапраўды так. Любое пазёрства ў выкананні «Песняроў» выглядала б няшчыра, ненатуральна.

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» зараз рыхтуецца да публікацыі кніга Юрыя Іванова, што будзе змяшчаць 150 старонак тэксту і 150 фотаздымкаў. У ліку іншых фота, якія распавядаюць пра надзвычай яркі творчы шлях самога фатографа, — і здымкі Мулявіна. Але і ідэю скласці альбом адно з фотаздымкаў Уладзіміра Мулявіна і «Песняроў» Юрый Іваноў вітае: так можна было б не толькі распавесці гісторыю гурта, але і паказаць незвычайную важнасць працы фотакарэспандэнта, яго творчы талент. Юрый Сяргеевіч зазначае:

— Сёння прафесію фотакарэспандэнта не лічаць творчай і ўнікальнай. Маўляў, кожны, хто мае фотаапарат ці нават тэлефон з камерай, так можа. У адказ працытую свайго сябра, выдатнага драматурга Аляксея Дударава, які кажа: «я не пішу з халодным носам, калі працую, проста плачу над сваімі творамі». Так і я: лічу, што ад добрага фотаздымка па скуры павінен ісці мароз. Як прыклад — выдатныя паэтычныя работы фотакарэспандэнта «Звязды» Яўгена Пясецкага, а таксама здымкі Віктара Стралкоўскага, Аляксандра Ружачкі, Віктара Ведзіна, Віктара Драчова, многіх іншых выдатных майстроў. Не ўсе ўмеюць працаваць так, як яны. Не ўсе маюць свой непаўторны творчы почырк.

Падчас гутаркі з Юрыем Івановым я неаднаразова задаю пытанне, якім ён памятае Уладзіміра Мулявіна, але шораз гутарку прыпыняе тэлефонны званок, а потым размова кіруецца ў іншы бок... Магчыма, сам Уладзімір Георгіевіч не хоча чуць адказу, а можа, адказаць на яго ў словах проста немагчыма. Як можна ў некалькіх радках змясціць успаміны пра добрага сябра? Юрый Сяргеевіч кажа:

— Думаю, на гэтае пытанне лепш за мяне адкажуць фотадзымкі. Калі мы сустракаліся, Мулявін глядзеў на мяне неверагодна цёплым поглядам. Ёсць здымак са стадыёна «Дынама», які, дарэчы, на выстаўцы прадстаўлены ўпершыню. Рыхтаваўся грандыёзны канцэрт, вялікая сцэна на футбольным полі, прысутнічала некалькі тысяч гледачоў. Я там быў, падышоў да сцэны яшчэ падчас наладкі апаратуры. Мулявін мяне ўбачыў і кажа ў мікрафон: «О, Юра Іваноў прыйшоў». Увесь стадыён гэта пачуў, усе звярнулі на мяне ўвагу. Было вельмі няёмка ад такой рэакцыі публікі, але неверагодна прыемна, што сябар мяне заўважыў.

«Песняры» ў Мсціславе, 1980 год.

Фота Юрыя ІВАНОВА.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Вечарына

КАЛІ ДУША СПЯВАЕ...

У сталіцы выступіў вядомы ва ўсім свеце квартэт Крыстыны Станька з Польшчы

Канцэрт ладзіўся ў межах джазавых вечароў у філармоніі і адбыўся дзякуючы падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску і Міністэрства культуры Беларусі. На сцэне выступалі Крыстына Станька (вакал), Пётр Леманьчык (кантрабас), Дамінік Букоўскі (электраксілафон, калімба), Тайлер Хорнбі (ударныя) (Канада).

Крыстына Станька — знакамітая спявачка з Польшчы. Закончыла факультэт джаза і сучаснай музыкі Акадэміі музыкі ў Катавіцах. Лаўрэат шматлікіх музычных конкурсаў. Акрамя таго, яна з'яўляецца аўтарам вершаў да сваіх песень, кампазітарам, аранжыроўшчыцай. Паспяхова займаецца педагагічнай дзейнасцю — выкладае джазавыя і эстрадныя спевы ў Гданьскай Акадэміі музыкі. Вядзе музычную праграму на «Радыё Гданьск». Крыстына Станька ўжо больш як 25 гадоў на сцэне. Са сваім калектывам выступала на джазавых фестывалях і канцэртах у Польшчы, Швецыі, Германіі, Расіі, Нарвегіі, Канадзе.

Голас Крыстыны заварожвае. Яна ўмела выкарыстоўвае яго арыгінальнае гучанне, што прыцягвае ўвагу аўдыторыі. Не расчаравала Крыстына і нас, беларусаў. Яе непаўторная манера выканання песень, лірычнасць, жаноцкасць абуджалі душу, краналі, узвышалі і ўзбагачалі адначасова. Сэрца спявала! Таленавіты квартэт з глыбокім пачуццём даносіў да слухачоў песні пра шчаслівае і неўзаемнае каханне; затаіўшы дыханне, слухала іх моладзь. Людзі старэйшага пакалення аддавалі перавагу творам філасофскага гучання, з жыццёвымі перыпетыямі, са складанасцю чалавечага суіснавання ў свеце. Сама спявачка прызналася, што яе душа жыве ў музыцы.

Прыемна было пачуць, як з вуснаў спявачкі лілася і наша беларуская народная песня — ёй неяк запомніўся куплет, пачуты ад студэнткі з Беларусі.

Дар'я ЛЁСАВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «КУПЦОВЪ», Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №220/D-5037, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 1, общей площадью 3 769,4 кв.м, наименование – производственный корпус № 1; Изолированное помещение с инв. №220/D-5039, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1, пом. 3, общей площадью 263,1 кв. м, наименование – фабрикатный цех. Нач. цена: 283 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 28 300 000 бел. руб. Шаг аукциона – 14 150 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №220/C-11460, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 58,3 кв.м, наименование – проходная-весовая. Капитальное строение с инв. №220/C-11455, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, 127, общей площадью 1242,9 кв.м, наименование – капустохранилище. Нач. цена: 601 243 920 бел. руб. без НДС. Задаток: 60 124 400 бел. руб. Шаг аукциона – 30 063 000 бел. руб.

Лот №3. Капитальное строение с инв. №220/C-11452, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 124, общей площадью 1799,2 кв.м, наименование – овощехранилище (картофелехранилище). Нач. цена: 986 824 260 бел. руб. без НДС. Задаток: 98 682 500 бел. руб. Шаг аукциона – 49 342 000 бел. руб.

Лот №4. Капитальное строение с инв. №220/C-11453, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 131, общей площадью 2 322,6 кв.м, наименование – овощехранилище. Нач. цена: 192 427 100 бел. руб. без НДС. Задаток: 19 242 800 бел. руб. Шаг аукциона – 9 622 000 бел. руб.

Лот №5. Капитальное строение с инв. № 220/C-11459, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Кирова, д. 127, общей площадью 14,4 кв.м, наименование – подстанция подсобного хозяйства. Нач. цена: 13 070 520 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 307 100 бел. руб. Шаг аукциона – 654 000 бел. руб.

Лот №6. Грузовой фургон МАЗ 43704 3, цвет белый, рег. знак АВ 5951-2, 2008 г. в. Нач. цена: 40 290 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 029 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 015 000 бел. руб.

Лот №7. Грузовой фургон GAZ-3309, цвет белый, рег. знак АЕ 2323-2, 2010 г. в. Нач. цена: 28 860 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 886 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 443 000 бел. руб.

Лот №8. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет голубой, рег. знак АА 4577-2, 1988 г. в. Нач. цена: 7 320 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 732 000 бел. руб. Шаг аукциона – 366 000 бел. руб.

Лот №9. Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, цвет синий, рег. знак АВ 1360-2, 1991 г. в. Нач. цена: 12 630 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 263 000 бел. руб. Шаг аукциона – 632 000 бел. руб.

Лот №10. Грузовой фургон GAZ-33021, цвет светло-серый, рег. знак АВ 6061-2, 1997 г. в. Нач. цена: 7 320 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 732 000 бел. руб. Шаг аукциона – 366 000 бел. руб.

Лот №11. Грузовой бортовой UAZ-3303, цвет зеленый, рег. знак 1091ВТР, 1991 г. в. Нач. цена: 7 710 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 771 000 бел. руб. Шаг аукциона – 386 000 бел. руб.

Лот №12. Автобус вагон PAZ 3205, цвет белый, рег. знак АВ 1518-2, 1993 г. в. Нач. цена: 17 040 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 704 000 бел. руб. Шаг аукциона – 852 000 бел. руб.

Лот №13. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №42. Нач. цена: 18 750 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 875 000 бел. руб. Шаг аукциона – 938 000 бел. руб.

Лот №14. Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-7,2, инв. №48. Нач. цена: 14 190 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 419 000 бел. руб. Шаг аукциона – 710 000 бел. руб.

Лот №15. Сеялка зерновая Directa 400 Corsa, инв. №592. Нач. цена: 81 210 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 8 121 000 бел. руб. Шаг аукциона – 4 061 000 бел. руб.

Лот №16. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №1711. Нач. цена: 18 750 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 875 000 бел. руб. Шаг аукциона – 938 000 бел. руб.

Лот №17. Культиватор чизельный КЧ-5,1, инв. №6108. Нач. цена: 18 750 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 875 000 бел. руб. Шаг аукциона – 938 000 бел. руб.

Лот №18. Сеялка механическая навесная СМН-12, инв. №7003. Нач. цена: 17 190 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 719 000 бел. руб. Шаг аукциона – 860 000 бел. руб.

Лот №19. Культиватор опрыскиватель универсальный КОУ-4/6, инв. №7700. Нач. цена: 8 670 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 867 000 бел. руб. Шаг аукциона – 434 000 бел. руб.

Лот №20. Агрегат комбинированный посевной АКП-4, инв. №9042. Нач. цена: 18 150 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 815 000 бел. руб. Шаг аукциона – 908 000 бел. руб.

Лот №21. Опрыскиватель прицепной штанговый Мекосан 2500-18, инв. №9045. Нач. цена: 24 330 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 433 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 217 000 бел. руб.

Лот №22. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №414. Нач. цена: 14 130 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 413 000 бел. руб. Шаг аукциона – 707 000 бел. руб.

Лот №23. Машина моечная лопастная Т1-КУМ-3 инв. №415. Нач. цена: 10 950 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 095 000 бел. руб. Шаг аукциона – 548 000 бел. руб.

Лот №24. Машина термоусадочная Profipack PR700, инв. №2012. Нач. цена: 12 440 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 244 000 бел. руб. Шаг аукциона – 622 000 бел. руб.

Лот №25. Грузовой бортовой GAZ–53А, 1981 г. в., цвет голубой, регистрационный знак АА 4591-2. Нач. цена: 4 160 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 416 000 бел. руб. Шаг аукциона – 208 000 бел. руб.

Лот №26. Насос Ж-6 ВНП 1032, инв. №447. Нач. цена: 8 560 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 856 000 бел. руб. Шаг аукциона – 428 000 бел. руб.

Лот №27. Насос Ж-6 ВНП 1032, инв. №2125. Нач. цена: 4 160 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 416 000 бел. руб. Шаг аукциона – 208 000 бел. руб.

Лот №28. Машина шинковальная РСНС КИМ, инв. №1051. Нач. цена: 7 760 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 776 000 бел. руб. Шаг аукциона – 388 000 бел. руб.

Лот №29. Электропогрузчик Амкодор Е-16, инв. №823. Нач. цена: 71 320 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 7 132 000 бел. руб. Шаг аукциона – 3 566 000 бел. руб.

Лот №30. Электропогрузчик NICHIYU FB10, инв. №1801. Нач. цена: 46 320 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 632 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 316 000 бел. руб.

Лот №31. Электропогрузчик NICHIYU FB10, инв. №1802. Нач. цена: 46 320 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 632 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 316 000 бел. руб.

Лот №32. Теплообменник (шпаритель), инв. №501. Нач. цена: 17 960 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 796 000 бел. руб. Шаг аукциона – 898 000 бел. руб.

Лот №33. Бланширователь-шпаритель, инв. №725. Нач. цена: 22 240 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 224 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 112 000 бел. руб.

Лот №34. Шпаритель, инв. №783. Нач. цена: 14 880 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 488 000 бел. руб. Шаг аукциона – 744 000 бел. руб.

Лот №35. Электропогрузчик вилочный CPDS15JD1, инв. №9029. Нач. цена: 33 840 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 384 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 692 000 бел. руб.

Лот №36. Skoda Octavia, 2008 г. в., рег. знак 9988АМ-2. Нач. цена: 37 522 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 752 200 бел. руб. Шаг аукциона – 1 877 000 бел. руб.

Лот №37. Полуприцеп ОДАЗ-855. Нач. цена: 4 763 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 476 300 бел. руб. Шаг аукциона – 239 000 бел. руб.

